ЧЫРВОНАЯ Змена

БЕЛАРУСКАЯ МАЛАДЗЁЖНАЯ ГАЗЕТА

ВЫДАЕЦЦА З 1921 ГОДА

ВЫХОДЗІЦЬ ПА ПЯТНІЦАХ

№ 8 (13540)

17 — 23 лютага 1992 года

Цана 1 рубель 50 кап. (па падпісцы — 35 кап.)

У нумары:

Ці прыйдуць да згоды дзяржавы СНД? 3

Вы хочаце купіць кааператыўную кватэру? Наўрад ці зможаце! 4

Ёсць такая партыя — партыя бальшавікоў! 6

Новыя творы маладых паэтаў і празаікаў — у "Крыніцах" 7—10

"Забытая слава", працяг кароткага агляду ваеннай гісторыі Беларусі, падрыхтаваны Г.Штыхавым, М.Ткачовым, А.Дзярковічам і іншымі гісторыкамі. 14

Хто будзе заснавальнікам "Чырвонай змены"?



Мы не хочам рабіць скандалу са "шлюбаразводнага працэсу", які, як бачна па ўсяму, пачнецца паміж нашым штотыднёвікам і ЦК Саюза Моладзі Беларусі. Але ўсё па парадку.

На XXX з'ездзе ЛКСМБ юрыдычна спыніў сваё існаванне заснавальнік "Чырвонай змены"– Цэнтральны Камітэт Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі Беларусі. Калі, як сцвярджаецца ў дакументах СМБ, арганізацыя змяніла не толькі сваю шыльду, але і сутнасць, то ёсць падстава лічыць, што былога камсамола не існуе. Аднак у рэспубліцы ідзе працэс адраджэння ЛКСМБ. Сёння стала рэчаіснасцю, што камсамол раскалоўся на два крылы, і калектыў рэдакцыі мяркуе, што газета павінна служыць на карысць інтарэсаў усёй моладзі.

Наша газета даўно зарыентавана на захаванне нацыянальнай спадчыны, адраджэнне роднай мовы і не жадае станавіцца аб'ектам палітычнага супрацьстаяння. Мы ўжо не гаворым пра эканамічныя цяжкасці, якія напаткалі рэдакцыю апошнім часам. Ні СМБ, ні ЛКСМБ сёння ўжо не ў стане быць заснавальнікамі, бо не могуць матэрыяльна забяспечыць выданне "Чырвонай змены".Газета існуе дзякуючы дзяржаўнай датацыі. Дапамогу ў гэтай цяжкай сітуацыі нам аказалі перш-наперш Камісія па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны Вярхоўнага Савета РБ, Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Сябры, як вядома, пазнаюцца ў бядзе.

Такім чынам, фармальны заснавальнік даўно ўжо страціў права на заснавальніцтва. Газета існуе дзякуючы дапамозе Вярхоўнага Савета, урада рэспублікі, высілкам рэдакцыйнага калектыву дый нашым чытачам. Зыходзячы з вышэй азначанага, калектыў штотыднёвіка "Чырвоная змена" сам вырашыў стаць заснавальнікам свайго выдання.

Мы прадбачым, што наперадзе – барацьба, перашкоды з боку зацікаўленых арганізацый... Але нашыя спадзяванні грунтуюцца на нашых правах. Паўторым яшчэ раз: чырваназменаўцы не жадаюць рабіць з усёй гэтай гісторыі глебу для плётак. Мы спадзяёмся на разважлівасць і добразычлівасць усіх бакоў, прадстаўленых у гэтым канфлікце.

ALFA

ПРА ШТО ДБАЮЦЬ СУСЕДЗІ

З усіх палітычных дзеячаў СНД найчасцей трапляе пад шквальны агонь крытычнага абстрэлу, бадай што, Леанід Краўчук. Расейскія сродкі масавай інфармацыі абвінавачваюць прэзідэнта Украіны то ў дэстабілізацыі нованароджанай Садружнасці, то ў непамерных вайсковых амбіцыях, то ў залішнім імкненні да суверэнітэту.

Асабліва шырокі грамадскі рэзананс атрымалі ў апошні час спрэчкі вакол лёсу Чарнаморскага ваенна-марскога флоту. Перыядычны друк падае іх як спробу Л.Краўчука захапіць караблі і. падводныя лодкі, але замоўчвае, што пытанне пастаўлена Украінай значна шырэй – размова ідзе аб маёмасці былога СССР, якую бессаромна падграбае пад сябе Расія.

Пачатак гэтай аднабаковай прыватызацыі пакладзены жнівеньскім путчам. Пасля перамогі дэмакратыі расейскае кіраўніцтва прысвоіла сабе ўласнасць і сродкі ЦК КПСС, якія, дарэчы, зароблены камуністамі і беспартыйнымі ўсёй краіны. Палітычныя лідэры Беларусі, Украіны, Казахстана і іншых рэспублік моўчкі праглынулі гэту пілюлю, збаяўшыся, відаць, быць абвінавачанымі ў прыхільнасці да кампартыі і путчыстаў.

З распадам Саюза Расія пераняла імперскія функцыі былога цэнтра, і яе апетыты значна ўзраслі. Расіяне крок за крокам прыбіраюць да сваіх рук маёмасць СССР за мяжой, яго валютныя сродкі, каштоўнасці дзяржаўнага сховішча, куды на працягу сямі дзесяцігоддзяў звозіліся знойдзеныя ў краіне скарбы. Буйныя прамысловыя цэнтры Поўначы і Сібіры, дзе пабудаваны магутнасці па здабычы карысных выкапняў за сродкі і рукамі працоўных усіх саюзных рэспублік, таксама аб'яўляюцца поўнай уласнасцю Расіі, якая вырашае – даць ці не даць вугалю, нафты і газу суседзям.

Зараз дайшла чарга і да войска. Нагадаем, што самая значная частка бюджэтных сродкаў СССР раней накіроўвалася на патрэбы абароны. Кошт матэрыяльных рэсурсаў, накопленых у вайсковых фарміраваннях, ацэньваецца сёння ў дзесяткі мільярдаў рублёў. Відаць, па гэтай прычыне прэзідэнт Расіі Б.Ельцын так настойліва патрабуе захавання адзінай для СНД арміі, камандаванне якой будзе размешчана ў Маскве і, вядома ж, падпарадкавана самому Барысу Мікалаевічу. А пакуль іншыя краіны Садружнасці дыскуціруюць вакол вайсковага пытання, расіяне не грэбуюць сарваць куш і з армейскай маёмасці. На сустрэчы ў Мінску Л.Краўчук паведаміў, што без ведама іншых дзяржаў СНД за мяжу прадаюцца караблі і падводныя лодкі Чарнаморскага ваенна-марскога флоту.

Вось і становяцца зразумелымі існыя прычыны патрабаванняў Украіны. Нельга не згадзіцца з думкай Краўчука, які заявіў у інтэрв'ю газеце "Правда": "Аказваецца, толькі адна рэспубліка ў нас мае на ўсё права – на ўвесь флот, на ўсе ўзброеныя сілы, на ўсе пасольствы і консульствы і гэтак далей, а іншыя гэтага права пазбаўлены. Мы не можам з гэтым згадзіцца і ніколі не згодзімся. Будзем адстойваць інтарэсы Украіны, інтарэсы яе народа".

Алег Камінскі.

ЗДАЕЦЦА, гэты чалавек прыйшоў семдзесят гадоў назад у жыццё, каб уласным сэрцам вымераць і адлюстраваць у фарбах наш боль. Жахлівая ваенная памяць Бухенвальда і Дахау , сённяшнія пакуты жыхароў з вёсак пад крылом Чарнобыля — усё гэта перажыў разам са сваім народам вялікі Майстра.

18 студзеня 1992 года вядомаму беларускаму жывапісцу, народнаму мастаку Міхаілу Андрэевічу САВІЦКАМУ споўнілася 70 год. Калектыў "Чырвонай змены" і яе чытачы шчыра віншуюць юбіляра.

Рэпліка

Кветкі ў брудзе

Было недзе 8 гадзін вечара. Вяртаючыся з работы, ішоў праз падземны пераход ля чыгуначнага вакзала. І тут... быццам вясною сярод лютага — чырвоныя пяшчотныя цюльпаны ў руках старэнькай бабулькі. Побач са звыклымі гваздзікамі ў акенцах кааператыўных кіёскаў — такая прыгажосць! Затрымаўся, пашнарыў у кішэні... Раптам — павольна, не зважаючы ні на што, да бабульчыных карабоў падышоў хлопец, з пароды тых, каго ў народзе прынята называць "амбаламі". І — нагамі па бабульчыных карабах з кветкамі!.. Старэчы лямант — як лязом па скуры... Чырвоныя цюльпаны, арэчаўлёная вясна — у брудзе, які нанеслі ў падземны пераход падэшвы пешаходаў. "Амбал", зрабіўшы сваю справу, крочыў далей. Бабулька ў слязах збірала раскіданыя кветкі.

Праз тры дні. Прыкладна ў той жа час, падземны пераход насупроць ЦУМа. Можаце не паверыць, але тая ж бабулька бегла па лесвіцы, прыціскаючы да сябе такія ж цюльпаны. Наверсе ўжо стаяла група падобных бабулек з кветкамі. Я ўжо падумаў выклікаць міліцыю, калі заўважыў... Хлопцаў у міліцэйскай форме з дубцамі, якімі яны адназначна круцілі вакол запясця, і, не стрымліваючыся ў выразах, гналі бабак з месца іх гандлю...

На першы погляд, каментарыі не патрэбны. У першым выпадку — пазбаўленне ад канкурэнтаў, але што ж у другім? Каму перашкаджаюць бабулькі, якіх, мусіць, нейкая фірма наняла прадаваць кветкі? Хутчэй за ўсё, нейкая прыбалтыйская кампанія вырашыла пацясніць мясцовых канкурэнтаў і завезла ў Мінск партыю цюльпанаў. Вядома, ёсць законы канкурэнцыі. Але ёсць і іншыя законы, і паводле гэтых законаў я лепей набуду свежы духмяны цюльпан, чым даражэйшыя за яго гваздзікі. Мне вельмі не хацелася б думаць, што прадстаўнікі органаў улады прынялі ўдзел у канкурэнтнай барацьбе не як трацейскія суддзі, а як прыхільнікі аднаго з бакоў. Вось менавіта з-за такіх выпадкаў і ходзіць сярод людзей меркаванне: "Які рынак, якая канкурэнцыя? Вакол — адны манаполіі, у якіх усё куплена, усё схоплена...". Не хацелася б бачыць новых пацвярджэнняў гэтага.

У. Ільін.

Слова — народу

Пытанне рэферэндуму зарэгістравана

За мітуснёю вакол сустрэчы прэзідэнтаў у Мінску мы неяк прапусцілі падзею, вельмі значную менавіта для Беларусі. Рэферэндум, аб якім ужо так многа сказана, нарэшце прайшоў першую прыступку. 13 лютага ў Цэнтральнай камісіі па рэферэндуму Рэспублікі Беларусь зарэгістравана пытанне, якое мяркуецца вынесці на рэферэндум. Яно гучыць так: "Ці лічыце вы неабходным правядзенне ўвосень 1992 года выбараў у вышэйшы орган дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь на падставе Закона "Аб выбарах народных дэпутатаў Беларусі", праект якога ўнесены Апазіцыяй БНФ у Вярхоўным Савеце, і ў сувязі з гэтым датэрміновы роспуск цяперашняга Вярхоўнага Савета?".

Як паведаміў старшыня ініцыятыўнай групы па правядзенню рэферэндуму У.І.Анцулевіч, з 14 лютага ініцыятыўная група мае права пачаць збор 350 тысяч подпісаў, неабходных для правядзення рэферэндуму. Пакуль ідзе падрыхтоўка да гэтай шырокамаштабнай акцыі. Падрыхтаваны таксама ўзор бюлетэня для галасавання.

ПЕРАЛІК пытанняў, разгледжаных на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД 14 лютага 1992 года ў г. Мінску

1. Пагадненне паміж дзяржавамі — удзельніцамі СНД аб сацыяльных і прававых гарантыях ваеннаслужачых, асоб, звольненых з вайсковай службы і членаў іх сямей.
2. Дэкларацыя аб захаванні прынцыпаў супрацоўніцтва ў рамках СНД.
3. Пагадненне паміж дзяржавамі — удзельніцамі СНД аб статуце Стратэгічных сіл.
4. Пагадненне паміж Рэспублікай Арменія, Рэспублікай Беларусь, Рэспублікай Казахстан, Рэспублікай Кыргызстан, Расійскай Федэрацыяй, Рэспублікай Таджыкістан, Туркменістанам і Рэспублікай Узбекістан аб Сілах агульнага прызначэння на пераходны перыяд.
5. Пагадненне паміж дзяржавамі — удзельніцамі СНД аб фарміраванні агульнага абароннага бюджэту і парадку фінансавання Узброеных Сіл дзяржаў Садружнасці.
6. Заява кіраўнікоў дзяржаў СНД аб тым, што ў сваіх узаемаадносінах дзяржавы — удзельніцы СНД не дапусцяць прымянення альбо пагрозы прымянення сілы.
7. Рашэнне Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД аб Савеце Міністраў абароны СНД.
8. Пагадненне аб вяртанні культурных і гістарычных каштоўнасцей дзяржавам іх паходжання.
9. Пагадненне аб прынцыпах забеспячэння Узброеных Сіл дзяржаў — удзельніц СНД узбраеннем, тэхнікай, матэрыяльнымі сродкамі, арганізацыі вытворчай дзейнасці рамонтных прадпрыемстваў, навукова-даследчых і доследна-канструктарскіх работ.
10. Заява кіраўнікоў дзяржаў аб узгадненні дзеянняў у правядзенні эканамічнай рэформы.
11. Пратакол Нарады кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў дзяржаў — удзельніц СНД аб падрыхтоўцы міждзяржаўнага Пагаднення аб раздзяленні актываў і пасіваў былога Дзяржбанка СССР.
12. Пратакол Нарады кіраўнікоў дзяржаў аб падрыхтоўцы дакумента аб правапераемніцтве дагавораў, усёй маёмасці, дзяржаўных архіваў, даўгоў і актываў былога Саюза ССР.
13. Пратакол Нарады кіраўнікоў дзяржаў аб даручэнні міністрам абароны дзяржаў — удзельніц Садружнасці падрыхтаваць з удзелам маршала Шапашнікава блок пагадненняў па ваенных пытаннях.
14. Пагадненне аб каардынацыйных органах чыгуначнага транспарту Садружнасці Незалежных Дзяржаў.
15. Пратакол Нарады кіраўнікоў дзяржаў аб даручэнні экспертам дзяржаў — удзельніц Садружнасці паскорыць падрыхтоўку пагадненняў аб парадку ратыфікацыі, адабрэння і выканання Дагавораў паміж СССР і ЗША па ваенных пытаннях.
16. Пагадненне аб каардынацыі міждзяржаўных адносін у галіне электраэнергетыкі Садружнасці Незалежных Дзяржаў.
17. Рашэнне Савета кіраўнікоў дзяржаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў аб прызначэнні Галоўнакамандуючага Аб'яднанымі Узброенымі Сіламі Садружнасці.
18. Пагадненне аб рэгуляванні ўзаемаадносін дзяржаў Садружнасці ў галіне гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва ў 1992 годзе.

КУР'ЕР ТЫДНЯ

Алег БЕМБЕЛЬ, сябра Управы Беларускай Хрысціянска-дэмакратычнай Злучнасці

\+

Ягайла-навыварат?

...як мусіў Праваслаўны князь карону
Ад Каталіцкае краіны ўзяць,
То давялося й веру памяняць...
...Пра гэта нагадаць хачу... Зянону.+

Ігар ДАБРАВОЛЬСКІ, беларускі аўтар-выканаўца

Наша грамадства (я маю на ўвазе беларускае грамадства) зараз адбівае ў сабе затаемнасць і цішыню. Калі спасылацца на дыялектыку, можна вызначыць, што ў хуткім часе нас чакае выбух, пачнецца разняволенне душаў.

Што ж да мяне як грамадзяніна, музыканта, рэжысёра, дык я лічу, што дасягнуў пэўнага прафесійнага пачатку. Адчуваю моц, прагу да працы. Ёсць жаданне працаваць, ствараць нешта. Можа, штосьці і атрымліваецца... Прыкладам таму — запрашэнне наведаць ЗША і Канаду. Мне ніколі не шанцавала так, як цяпер.

Што ж датычыць нейкіх з'яў — палітычных ці грамадскіх, дык я б не ставіў першым пунктам Мінскую сустрэчу кіраўнікоў СНД. Вось пачатак кампаніі за рэферэндум — іншая справа, гэта датычыцца кожнага беларуса.

Лорэн НЭЛЬСАН, хрысціянскі прапаведнік з ЗША

У Беларусі я болей чым месяц. Уражвае, як народ пачынае пакрысе кіраваць сваім жыццём. Мне цікава за гэтым назіраць. Я шмат гаварыў з людзьмі. Каб усё спазнаць непасрэдна, з жонкаю Ліндаю ездзім на грамадскім транспарце.

Ведаю, што ваш народ знаходзіўся то пад уладаю палякаў, то Масквы... Прыемнаю нечаканасцю для мяне было памкненне самім кіраваць дзяржаваю. З радасцю магу сцвярджаць, што ў вас вялікая прага да духоўнасці, да маральнага росту. І скарыў мяне беларускі жывапіс. Некалькі карцінаў я нават зняў на відэакамеру.

На ўсё воля Бога, і, магчыма, некалі зноў наведаю вашу краіну. Заўтра ж у мяне ў Мінску апошняя лекцыя.

Адзінаццаць + Шапашнікаў = СНД

Мы з дзяцінства прывыклі: кіраўнікі дзяржаў збіраюцца разам не для таго, каб абмеркаваць нейкія праблемы, а каб проста паставіць свае подпісы пад дакументам, які да гэтага распрацавалі чыноўнікі адпаведных міністэрстваў. На гэты ж раз было па-іншаму.

Сустрэча лідэраў дзяржаў — членаў СНД пачалася яшчэ ў аэрапорце. Неўтаймаваныя журналісты даведаліся, што на парадку дня ў асноўным будзе стаяць пытанне аб войску, і прама ля трапа самалёта закідвалі прэзідэнтаў пытаннямі менавіта на гэтую тэму. Дарэчы, звярніце ўвагу: сярод кіраўнікоў СНД 10 прэзідэнтаў і толькі адзін Старшыня Вярхоўнага Савета — наш Станіслаў Станіслававіч Шушкевіч. Тыя, хто прывык думаць, што Беларусь пастаянна ідзе ў хвасце Расіі, склалі сваё меркаванне і на гэты раз: Рэспубліка Беларусь падтрымае Ельцынскую пазіцыю — захаванне адзінай арміі. Тым не менш, ужо з раніцы 14 лютага стала вядома, што некаторыя рэспублікі ідэю адзінага войска не падтрымаюць. Прэзідэнт Малдовы Мірчэ Снегур не паспеў яшчэ прайсці і дзесяці крокаў па беларускай зямлі, як заявіў, што любая незалежная дзяржава не можа абысціся без самастойных узброеных сіл. Пачатак быў пакладзены, бо такія заявы ўліваліся ў журналісцкія мікрафоны і тэлекамеры да самага вечара.

Сцюдзёны аэрадромны вецер, здавалася, выдзьмуў з нашых калег рэшткі цярпення, калі сіваглавы Барыс Мікалаевіч выйшаў з лайнера, на якім вялізнымі літарамі была напісана "Россия". Спусціўся па трапу, павітаўся з Шушкевічам і... не кінуўшы нават позірку ў бок прэсы, рушыў у накірунку да чорнага "ЗІЛа". Крыху статыстыкі: *прэзідэнта Снегура, які прыляцеў першым, сустракала менш чым дзесяць журналістаў, а паглядзець у светлыя вочы Ельцына нашага брата сабралася чалавек пяцьдзесят...* Уявіце, які лямант узняўся над змерзлымі журналістамі! Ельцын усё ж такі сказаў некалькі слоў, чым узнагародзіў прэсу за адданае чаканне. Гэта не проста замалёўкі жыцця. Гэта канстатацыя таго, што менавіта Расія Ельцына не толькі юрыдычна, але і фактычна заняла месца былога Савецкага Саюза, адкінуўшы ўбок такія "малазначныя" краіны, як Беларусь, Малдова і г.д.

Як аказалася, усё ж скептыкі памыляліся. У вайсковым пытанні Беларусь разам з некаторымі іншымі рэспублікамі заняла пазіцыю, якая не зусім адпавядае пазіцыі Расіі. Юрыдычна гэта выглядае так: "Канстытуцыйны прынцып Рэспублікі Беларусь — нейтралітэт, у сувязі з чым наша рэспубліка не можа мець з кімсьці агульных узброеных сіл, не можа ўступаць у блокі з іншымі дзяржавамі." На прэс-канферэнцыі, якая адбылася позна вечарам 15 лютага, Станіслаў Шушкевіч заявіў аб гэтым ціха, але цвёрда.

З аэрапорта "Мінск-2" мне давялося ехаць у аўтобусе маскоўскай дэлегацыі. Пад час размовы з адным з экспертаў высветлілася, што дакументы, падрыхтаваныя да сустрэчы , вельмі "сырыя", і ўсё павінна вырашыцца толькі пад час перагавораў. Што вырашылася? Маршалу авіяцыі Шапашнікаву ўдалося ўсё ж на бліжэйшы час захаваць адзіныя ўзброеныя сілы. Гэты ж бліжэйшы час атрымаў назву "пераходны перыяд". Адзінае ж, у чым Шапашнікаў атрымаў абсалютнае задавальненне — гэта ў тым, што дабіўся прыняцця дакументаў аб сацыяльнай абароне ваеннаслужачых. Відаць, выбухаў незадавальнення ў арміі ў бліжэйшыя месяцы не будзе.

Але народ чакае не гэтага. Людзі прагнуць навядзення парадку ў эканоміцы. Сярод 20 дакументаў, якія былі падпісаны ў будынку былога ЦК КПБ, былі і эканамічныя пагадненні. Як заявіў на прэс-канферэнцыі прэзідэнт Украіны Краўчук, цяпер прадпрыемствам розных рэспублік, дадзена магчымасць супрацоўнічаць без усялякіх абмежаванняў. Будзем спадзявацца, што інтэграцыя, разбураная палітычнымі працэсамі, пачне аднаўляцца. І ўсё ж большасць эканамічных пытанняў перанесена на чарговую сустрэчу лідэраў СНД, якая адбудзецца ў Кіеве.

Усіх цікавіць, што ж будзе з Чарнаморскім флотам? Л.Краўчук бескампрамісна заявіў, што Украіна прэтэндуе толькі на тую частку флоту, якая неабходная для аховы яе марскіх граніц. Ельцын на гэта не адказаў нічога. На прэс-канферэнцыі яго проста не было.

Ці можна думаць, што блытаніна, якая існуе ў адносінах паміж рэспублікамі, нарэшце прымае абрысы пэўнага парадку? Аб гэтым гаварыць рана. Ну як, адкажыце мне, могуць удзельнічаць у Садружнасці Арменія і Азербайджан, калі прэзідэнт апошняга прама з-за стала перагавораў прымушаны ляцець у Баку, каб кантраляваць чарговы выбух ваенных дзеянняў у Карабаху? Хто ж рассячэ гэты "гордзіеў вузел"? Зараз ні ў каго не хапае самаўпэўненасці, каб даваць з гэтай нагоды аптымістычныя прагнозы. Сустрэч, падобных мінскай, будзе яшчэ шмат. Сапраўды,час брацца за розум настаў.

Алесь Палынскі.

Фота С.Брушко.

На здымках:

- Мірчэ Снегур сцвярджае...
- Добры вечар, Барыс Мікалаевіч.
- Пачатак сустрэчы ў былым ЦК КПБ.
- Як справы, прэзідэнты?
- Не з усіх чырвоных сцягаў яшчэ пашытыя кашулі.



«НАМАЛЮЮ САБЕ ДОМ...»

Пры любым сацыяльна-эканамічным ладзе, пад любымі лозунгамі і на шляхах да любой светлай будучыні людзі мараць мець дах над галавой, сваю ўласную кватэру. Па дваццаць і болей год даводзіцца чакаць, пакуль падыдзе чарга і яны атрымаюць запаветныя ключы, якія пасля стольких год чакання становяцца сапраўды залатымі. Таму зразумела жаданне паскорыць гэтае салодкае імгненнё, наблізіць яго. Сёння такая мажлівасць ёсць — кватэру можна набыць. Толькі як, за колькі і каму дазволена гэта зрабіць? Па адказы я звярнуўся да загадчыка вытворчага аддзела ўпраўлення жыллёвай гаспадаркі гарвыканкама Ларысы Васільеўны ПРУДНІКАВАЙ.

– Скажыце, калі ласка, Ларыса Васільеўна, ці можна набыць афіцыйна кватэру за валюту?

— Ніводнага рашэння, якое б гэта дазваляла, няма. Продаж кватэр праходзіць адпаведна з пастановай № 67 Савета Міністраў.

– А ці праўда, што пры гарвыканкаме існуе асобная чарга, дзе стаяць людзі, якім набыццё кватэры афармляецца як за савецкія рублі, але плацяць яны валютай?

— Мне нічога пра гэта невядома, але наўрад ці такое магчыма.

– Што неабходна для таго, каб набыць кватэру ва ўласную маёмасць?

— Самая галоўная ўмова — пастаянная мінская прапіска. Акрамя таго, вы павінны стаяць у чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў. У райвыканкамах вядзецца ўлік усіх, хто жадае набыць кватэру, але ў першую чаргу дазваляецца выкупляць тыя кватэры дзяржаўнага фонду, якія валодаюць паніжанымі жыллёвымі якасцямі (прахадныя пакоі, сумешчаныя санвузлы, негабарытныя кухні і г.д.). Адзначу — выкупляюцца толькі кватэры дзяржаўнага фонду. Але, прынамсі, свабоднага рынку кватэр у нас пакуль яшчэ няма.

– А ці існуюць ільготы пры набыцці кватэры?

— Безумоўна. У першую чаргу могуць выкупляць свае і набываць іншыя кватэры ўдзельнікі вайны, перадавікі вытворчасці, звольненыя ў запас і інваліды па стану здароўя.

– А хто вызначае, колькі каштуе кватэра?

— Ацэначная камісія, якая створана пры кожным райвыканкаме. Туды ўваходзяць прадстаўнікі райвыканкама, жыллёва-эксплуатацыйнай службы, службы тэхнічнай інвентарызацыі і іншыя ўпаўнаважаныя асобы.

– Растлумачце, калі ласка, як і што трэба рабіць, каб выкупіць жыллё?

— Неабходна напісаць заяву на імя старшыні райвыканкама, узяць даведку аб складзе сям'і ў ЖЭСе і характарыстыку сваёй кватэры. Пасля гэтага ацэначная камісія вызначае, колькі каштуе кватэра, і ўзгадняе лічбу з гаспадаром кватэры, пасля чаго райвыканкам прымае рашэнне аб продажы. Уладальнік пераводзіць дамоўленую суму на рахунак ЖЭС, а той у сваю чаргу на працягу месяца — у раённы бюджэт. Пасля ўсяго ў натарыяльнай канторы складаецца акт куплі-продажу, і новаму гаспадару выдаюцца ўсе неабходныя дакументы.

– А хто будзе тэхнічна абслугоўваць кватэру?

— Новы гаспадар павінен падпісаць у ЖЭСе дагавор на такое абслугоўванне.

– Калі, напрыклад, я развёўся з жонкаю і маю намер набыць кватэру. Ці можна мне гэта зрабіць?

— Толькі ў тым выпадку, калі вы стаіце ў райвыканкаме ў чарзе на паляпшэнне жыллёвых умоў.

– Як вы лічыце, ці захаваецца ў далейшым дзяржаўнае будаўніцтва кватэр? Альбо будзе толькі кааператыўнае?

— Ходзяць розныя чуткі, але ніякіх дакументаў пакуль што яшчэ няма. Я лічу, што захаваецца і тое, і другое будаўніцтва.

– Ці нармальна гэта, калі пярвічны ўзнос за двухпакаёвую кааператыўную кватэру складае 60 тысяч рублёў? Ці ёсць у простых людзей такія накапленні?

— Канешне, не. Але ж вы самі ведаеце, што кошт будматэрыялаў вырас у 7—9 разоў.

– Ці можа хто-небудзь атрымаць кватэру ва ўласную маёмасць бясплатна?

— Такое магчыма ў двух выпадках: для інвалідаў ВАВ, якія маюць не болей як дваццаць квадратных метраў агульнай жыллёвай плошчы на кожнага члена сям'і, і тым, каму выдзелілі дзяржаўныя кватэры ўзамен знесеных уласных дамоў, але яны не атрымалі за гэта грашовай кампенсацыі. Апошняя ўмова не распаўсюджваецца на нашчадкаў былых гаспадароў уласных дамоў.

– Апошняе пытанне, Ларыса Васільеўна: ці выкупілі б вы самі сваю кватэру?

— Я б выкупіла абавязкова. Адзінае што: мая аднапакаёвая кватэра дзеля гэтага не падыходзіць.

Зм.Лукашук.

НАШЫ КАЛЕГІ

"НКВ" — ГАЗЕТА ДЛЯ ВАС, ДЗЕЛАВЫЯ ЛЮДЗІ!

Пяць месяцаў – ці шмат гэта? "Дастаткова для таго, каб сур'ёзна заявіць аб сваім існаванні!",– лічыць рэдакцыйны калектыў "Навукова-камерцыйнага весніка", які пачаў выдаваць у верасні мінулага года сваю газету. З'яўленне новага выдання заўсёды прадвызначае два галоўныя пытанні ў тых, хто, праглядваючы шэраг інфармацыйнай прадукцыі, зацікавіўся незнаёмай назвай. Якія мэты мелі стваральнікі "Навароджанага"? Які шлях вызначыў рэдакцыйны калектыў? І, як кажуць, каму, як не ягонаму выдаўцу, прасвятліць дадзеную сітуацыю?

На пытанні адказвае дырэктар Беларускага цэнтра абслугоўвання навуковых даследаванняў Аляксандр СЫШЧАНКА.

— Скажыце шчыра, навошта вам спатрэбілася свая газета? Няўжо мала ў кіёсках розных камерцыйных выданняў з самай разнастайнай рэкламай?

— Мне здаецца, што назва нашага цэнтра, які мае больш чым дзесяцігадовы вопыт работы на рынку навукова-тэхнічнай інфармацыі, гаворыць сам за сябе. "НКВ" — гэта эфектыўны канал распаўсюджвання рэкламы навукова-тэхнічнай прадукцыі. Кола нашых пантэнцыяльных падпісчыкаў — шматлікія навукова-даследчыя арганізацыі і прамысловыя прадпрыемствы, усемагчымыя інстытуты і цэнтры, ад гігантаў да невялікіх кааператываў і малых прадпрыемстваў у нашай краіне і за мяжой.

Наша газета мае сваю асаблівасць — вы не зможаце набыць "НКВ" у кіёсках "Саюздруку". Яна дасылаецца толькі падпісчыкам, якія вырашылі ўступіць у нашу інфармацыйна-рэкламную сістэму.

— Растлумачце, калі ласка, сваю думку. Што гэта значыць?

— Сістэма дае магчымасць звязаць у адзіную сетку вытворцаў і спажыўцоў навукова-тэхнічнай прадукцыі, што дазваляе прадпрыемствам не толькі рэкламаваць сваю прадукцыю, але і заказваць неабходныя тэхналогіі, прыборы, спецыяльнае абсталяванне (ёсць жа яшчэ, нягледзячы ні на што, у нашай вытворчасці людзі, якія зацікаўлены ў яе мадэрнізацыі), а распрацоўшчыкам (ВНУ, інстытутам, асобным даследчым групам) — рэкламаваць распрацоўкі, падрыхтаваныя для ўкаранення.

"НКВ", такім чынам, можна параўнаць з люстэркам, у якім адлюстроўваюцца і патрэбнасці вытворчасці, і рэальная каштоўнасць той ці іншай распрацоўкі.

— Ці нельга праілюстраваць вашыя словы канкрэтным прыкладам?

— Калі ласка. Напрыклад, вы — галоўны тэхнолаг прадпрыемства. А на любым з іх існуе маса тэхналагічных праблем. І з нашай дапамогай вы хутка знойдзеце прафесіяналаў, здольных у самыя кароткія тэрміны вырашыць вашы цяжкасці. Вы змяшчаеце ў газеце заказ, а ўжо распрацоўшчыкі знаходзяць вас самі. Зразумела?

— Цалкам. А як гэта можна зрабіць?

— Няма нічога лягчэй. Трэба толькі аформіць падпіску на "НКВ", заплаціўшы ўсяго 998 рублёў за год, і вы ўключыцеся ў нашу сістэму.

— А ці не вельмі дорага мне гэта абыдзецца?

— Вы дарэмна так іранізуеце. Па-першае, у звычайных выданнях за разавае змяшчэнне рэкламы вы заплаціце нашмат больш. Па-другое, аўдыторыя штомесячніка — гэта не хатнія гаспадыні, а сапраўдныя дзелавыя людзі — навукоўцы, распрацоўшчыкі, вытворцы і г.д. Акрамя таго, вы набываеце права бясплатна публікаваць свае рэкламныя аб'явы на працягу года на нашых старонках і спецвыданнях на замежных мовах. Пры гэтым усе работы па рэдагаванню, афармленню і пераkладу аб'яў рэдакцыя бярэ на сябе. Ваша справа толькі заказваць рэкламу. Гэта абыдзецца вам прыкладна ў 5-10 разоў танней, чым у іншых выданнях. Плюс да таго — перспектыва выхаду на міжнародны рынак інфармацыі.

Праўда, ёсць і іншы варыянт падпіскі. Можна заплаціць усяго 198 рублёў, але кожнае змяшчэнне рэкламы будзеце ўжо аплачваць дадаткова з разліку існуючых рыначных цэн.

— Цікава, якая сфера ўплыву вашай газеты?

— "НКВ" распаўсюджваецца на тэрыторыі Беларусі, Украіны, еўрапейскай часткі Расіі. Ужо ёсць падпісчыкі ў буйных прамысловых цэнтрах Урала і Сібіры. З часам спадзяёмся на значнае павелічэнне тыражу.

У ліку прапануемых намі паслуг — "Прэзентацыя фірмы". Так, да прыкладу, у першым нумары мы прадставілі Фізіка-тэхнічны інстытут Акадэміі навук Беларусі — вядучы ў гэтай галіне навукі. Акрамя яго, сваю рэкламу далі такія буйныя "фірмы" — Магілёўскі машынабудаўнічы інстытут, Кіеўскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці, Мінскі радыётэхнічны тэхнікум, малыя прадпрыемствы "Экаінкам", "Альбатронікс", "Экста", НТА "Палітэхнік" з Мінска і шмат іншых. Яны прадставілі розныя тэхналогіі і інструменты, аўтаномныя праграмныя прадукты, аўтаматызаваныя працоўныя месцы і г.д. Іх рэклама — скарб для дзелавых людзей. Выпісаўшы "НКВ", апошнія пазбаўляюцца ад неабходнасці перагортваць горы неспецыялізаваных рэкламных выданняў, дзе за абывацельскімі рубрыкамі "Куплю-прадам-мяняю" зацікаўленаму чалавеку нават цяжка арыентавацца.

— І якія першыя вынікі? Не баіцеся "прагарэць" з "НКВ"? Ці апраўдвае сябе газета?

— Ведаеце, на першым часе для нас нашмат важней не прыбыткі, а ўключэнне ў нашу інфармацыйна-рэкламную сістэму як мага больш людзей і фірм, г.зн. атрыманне такой неабходнай інфармацыі самім цэнтрам. Акрамя таго, займаемся спонсарскай дзейнасцю. Напрыклад, выпісалі сто экземпляраў газеты "Паветраны вартавы" для пераможцы агляду-конкурсу на лепшую вучэбна-матэрыяльную базу — воінскага калектыву, які ўзначальвае афіцэр А.Міхайлаў. Тым самым мы вырашылі стымуляваць далейшы ўдзел воінаў, большасць з якіх складаюць нашы землякі, у навукова-тэхнічнай творчасці. Не сакрэт жа, што ў іх ліку — нашы патэнцыяльныя падпісчыкі, змена сённяшнім распрацоўшчыкам і заказчыкам новых тэхналогій і прадукцыі.

— Аляксандр, вялікі дзякуй за інтэрв'ю. Шчыра жадаю поспеху вашаму цэнтру і маладой газеце! А тым, каго зацікавіла новая рэкламна-інфармацыйная газета, па сакрэту паведамляем адрас: 220050, г.Мінск-50, а/с 135. Кантактны тэлефон: 26-55-54.

Гутарыў Аляксей Безвясельны.

Лапцевая пошта

Пра тое, як я рашыў бабылём застацца

У РЭДАКЦЫЮ ГАЗЕТЫ "ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА"

Шаноўныя рэдактары! Даруйце мне, вясковаму чалавеку, што не з вялікага розуму ў газету палез, а з-за доўгіх, як у таго зайца, вушэй ды моцнае, каб яна хварэла, дапытлівасці. Гора, як кажуць, і прымусіла. Толькі ж я не пісьменнік які, не падумайце, каб за здарова жывеш паперу гвалтаваць, яе вунь і так, кажуць, на купоны не хапае. А таму ў сваіх лістах пастараюся коратка ды ясна, як, бывала, Ільіч на партыйным з'ездзе, абмаляваць вам усю вастрыню сучаснага моманту і паставіць пытанні, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння. Найперш хачу заверыць, што з умовамі ліставання азнаёмлены і таму ніякіх там фактаў, цытат, эканамічных звестак, асабістых імён ці, крый Божа, геаграфічных назваў ды іншай крамолы, якая не падлягае адкрытай публікацыі, ужываць не буду, бо, шчыра кажучы, не зусім дакладна ведаю, якога роду адказнасць нясуць за яе падобныя мне небаракі-аўтары, а таму не хачу лезці на ражон. Лепей ад граху падалей.

Ліст першы

Праўда-праўда! Каб мне з гэтага месца не сысці. І турбуе мяне цяпер, дарагія рэдактары, адно-адзінюсенькае пытанне. Помніце, быў такі падатак — халасцяцкім называўся. А ў народзе, калі між намі, ахрысцілі яго, прабачце, падаткам на тое месца, якім дзяцей стругаюць. Помніце ж, збіраліся яго ўсё адмяніць — гуманная такая акцыя была з боку дзяржавы. Дык ці праўда, ці не, даражэнькія, плешчуць людзі, а на кожны раток не накінеш платок, нібыта падатак той ізноў вяртаюць і пакрываць яго будуць мужыкі ці то беларускімі купонамі, ці то амерыканскімі далярамі — адна трасца. Свят-свят, рад бы не паверыць, ды лапцевая пошта трубіць, а пры нашым перадохшым сацыялізьме якіх толькі цудаў не бывае. Падзешавела ж вунь электрыка ў чатыры разы, каб затым падаражэць у восем. Падзешавеў жа газ, каб узяць дый знікнуць назад у нетры...

Не ведаеце, што такое лапцевая пошта? Авой, родненькія, па ўсім відаць, у вёсцы не жылі. А гэта, да прыкладу, як у вас "Саюздрук" — служба такая па распарсючванню навін нашага літайпнага агенцтва АБС (Адна Бабка Сказала).

Ды я не аб тым. Нядаўна во да сябра на вяселле ездзіў. Ой, што я вам зараз распавяду — цэлая гісторыя. Слухайце ж...

Мой сябрук, ладны такі дзяцюк і ў гадах, ледзьве быў бабылём не застаўся. А ўсё праз дурную галаву, тады, як у крамах застой працвітаў і глыбокая дэпрэсія, не сабраўся, а ці яму дзевак не было. Кажуць разумныя людзі: не адкладвай на заўтра тое, што можна зрабіць да перабудовы. Не слухаў, бугай. Знайшоў нарэшце дзеўку — ды бяда, зніклі касцюмы ў краме, пакуль бегаў, касцюм шукаў, зніклі чаравікі, не ісці ж да шлюбу ў палапленых шкарпэтках, пакуль стаяў у чарзе па чаравікі, на табе, заручальныя пярсцёнкі перайшлі ў разрад прадметаў раскошы, пакуль збіраў грошы на тую раскошу, натуральна, знікла сама дзяўчына. Дальбог, кругаварот вады ў прыродзе. Так, дзяўчаты — не дэфіцыт, але ж не чаравікі, па візітоўках не выдаюцца. І вырашыў мой сябрук на гэты раз хітрэйшым быць, як-ніяк старога вераб'я на мякіне не ашукаеш.

І давай ён запасы рабіць, так сказаць, на чорны дзень, ці, як любяць казаць сельсавецкія "папы", на самы светлы ды радасны дзень у ягонай маладой жысці. Надыбаў касцюмаў — хоць ты ў лекцыянеры запісвайся, чаравікамі ўвесь запечак зафундоліў, кашуль у яго, як даўней у карабейніка. Больш таго, вам скажу, ясныя-яснюсенькія віды паявіліся ў хлапца на сваю ўласную кватэру. Бо рай у будане, гэта, казаў, ат... ат... атравізм. І чаго ж яму, людцы, не хапала, скажыце? А жонкі яму не хапала. Але чакайце — не час яшчэ. На вяселлі тыя чаравікі грызці не будзеш ды кашулямі закусваць. Памятаеце ж, як даўней казалі:

І я там быў, мёд-піва піў...

Кінуўся небарака па мёд ды па піва, а тут яго рынак хапе за каршэнь. Адчуваеце ўсю вастрыню сучаснага моманту? Ляжыць піва, узяць нельга, бо ў сярэдзіне цэннік. Ляжыць сабе і кусаецца. А як жа, за сем рублёў і пляшка каго заўгодна ўкусіць. Здэцца шчэ і не піў, а ўжо галава ў скокі пайшла. Адшпіліў, карацей, хлапец ладны кус — купіў піва. Тым часам ехаць па мёд нешта расхацелася. А навошта ён нам, эсэндэнаўскім людзям, той мёд? Ды супроцьпаказаны. Ды халяргія ў нас на яго. А ўключыце лепей тэлевізар, а прыслухайцеся, як складна дзядуля

Барыс казкі расказвае пра залаты рынак і разбітае карыта — і жыццё мёдам пакажацца. Ня пі, ня еш і з хаты ня лезь.

І не палез бы з хаты, ды вось жаніцца, халера, прыспічыла. Паехаў мой сябрук па гэты, як яго, забыўся зусім. Яшчэ загадка пра яго ёсць: не лае, не кусае і ў хату не пускае. Ага, успомніў: сервеблат-кілбаса такая вэнджаная, адзін кэгэ за дзвесце рэ. Карацей, ажаніўся хлопец, дадому прыехаў з тэй кілбасой — маці ў хату не пусціла, не прызнала: стаіць з сервеблатам, але без штаноў. Э, не, думае хлапец, жонка не маці, і без штаноў не ацураецца, пад коўдраю яно там не відаць. Толькі за сталом на вяселлі ўседзець, каб чаго не западозрылі. А для гэтага трэба, каб людзі добра вочы пазалівалі. І адным півам тут не абыдзешся. Кінуў хлапец работу ґ заняўся, так сказаць, індывідуальнай працоўнай дзейнасцю, балазе закон цяпер на яго баку. А што ж я, сабе думае, дурней за дэмакрата, прадпрынямацелем не магу стаць? А закон — ён як дышла, мае вы людцы, куды павярнуў змеявік, туды гарэлачка і выйшла...

І прывёз ён сабе дзеўку добрую, і згулялі яны вяселле па-людску.

Ешце, сваты, рэпу,
У нас морквы нету,
Была свіння Ксіння,
Паела націння,
Быў парсюк Воўка,
Паеў усю моркву...

Як нагледзеўся я, даражэнькія рэдактары, тога вяселля, як наслухаўся — стала мне горка без гарэлкі. "Горка" — крычу. Ажнуль гляджу: спалатнеў мой сябрук, а ўставаць з-за стала, цалавацца-мілавацца не спяшае. Глядзіць на мяне, як на ворага лютага, а мне і няўцям. Каб жа я, дурань, ведаў, што ён у палажэніі... Ой ты, барыня-маскоўка, без штаноў хадзіць нялоўка.

А для чаго вам усё распавядаю, шаноўныя рэдактары? Бо, адчуваючы ўсю далікатнасць сучаснага моманту, адважуся ўсё ж запытацца ў вас, мо чулі там у сталіцы, га? Кажуць, увесь пераходны перыяд маладым да шлюбу будуць выдаваць з двух адно: двухспальны ложак альбо штаны, заручальныя пярсцёнкі за паўцаны альбо скрыню гарэлкі. А ў парадку гуманітарнай дапамогі — амерыканскі прысерваціў шматразовага карыстання, калі панюхаеш яго, пахне бананам, а на смак — наша морквіна. А яшчэ, кажуць, уводзіцца мода новая: за вясельным сталом заміж каравая купоны дзяліць.

Калі так, то я, браточкі, тады цур у бабылях застаюся. І што вы думаеце — не прайграю. Тут, родненькія, эканамісты ўсё дакладна пралічылі, дай ім Бог не хуткай адстаўкі. Эканамісты — залатыя людзі, яны ведаюць, што мне на квартал трэба 0,3 кэгэ мыла туалетнага, на месяц — 0,2 кэгэ алею, на тыдзень — 0,000001 жонкі ўласнай. Хочаш болей — калі ласка, толькі ў кааператараў і за свабодна канверсаваную валюту. Ды ў мяне цяпер не жыццё, а нарыхтпромаўская маліна. Эканамісты падлічаць, колькі мне трэба з'есці, астролагі раскажуць, куды лепей заўтра пайсці — ці на той свет, ці на чарговую прэзентацыю, парламентарыі нагадаюць, колькі мне трэба ўзяць зямлі ў індывідуальнае карыстанне, акурат каб іх саміх на той зямельцы пракарміць. Скончылася гарэлка? Няма праблем. Бярэш пустую пляшку, наліваеш чыстай вадзіцы і... крэкс-фэкс-пэкс, Алан Уладзіміравіч, дапамажы. (І як мой сябрук не дадумаўся?). Скончылася рэклама на тэлевізары — сядзі, чакай новай, Менатэп, Інкомбанк, Абракадабра — я іх усіх на памяць вывучыў. Скончылася цярпенне...

Дарэчы, шаноўныя рэдактары, ці не падкажаце, баюць людзі, нібыта цярпення ў народа засталося з гулькін нос і хутка яго будуць выдаваць па кіло на рыла і з прад'яўленнем пашпарта. Не чулі, га?

На гэтым, ведаючы, што вы людзі дзяржаўныя, занятыя, заканчваю. Даруйце, калі што не так.

З павагай

Міхась Валоха з-пад Лепля.

АД РЭДАКЦЫІ: Ліст друкуецца з захаваннем аўтарскага стылю і арфаграфіі.

ЧЫРВОНАЯ МАГІЯ

Вечарам таго ж (дарэчы, зусім звычайнага) дня мне патэлефанавалі. "Ненавідзець ворагаў лягчэй і больш захапляльна, чым любіць сяброў, — спёхам, пад брынканне тэлефона-назолы я дачытвала апошні абзац. — Ад людзей жа, якія больш заклапочаныя вынішчэннем праціўніка, чым удасканальваннем гэтага свету, наўрад ці можна дачакацца вялікага дабра". Са шкадаваннем ледзь адарвалася ад кніжкі, бо лямант "набытку цывілізацыі" нахабна не змаўкаў і, здаецца, здолеў бы ўзняць нябожчыка з магілы. На стрыманае "алё" з трубкі шпарка вымавілі, відаць, загадзя падрыхтаванае: "Вечар добры, гэта — Лапін Аляксандр Аляксандравіч. Памятаеце, мы сёння з вамі ўжо размаўлялі". "Размаўляць размаўлялі", — адразу падумалася мне, але іншая здагадка перабіла першапачатковы ход думак, і я недаўменна запыталася: "Адкуль у вас нумар майго тэлефона?". І што ж, шаноўнае спадарства, давялося пачуць у адказ на ўпаўне законнае, па-першае, а па-другое, зусім цнатлівае пытанне: "Вы недаацэньваеце партыю, з якой маеце справу", — шматзначна, нат какетліва, абвясціла "слухаўка". Пасля гэтых слоў у мяне, пэўне, павінны былі расшырыцца зрэнкі, бо я абавязкова ўяўлю сабе — "Аўрора" на Свіслачы, жэрлы гарматаў нацэлены на штаб каардынацыйнага цэнтра СНД, вось-вось грымне выбух...

8 лістапада 1991 года ў Санкт-Пецярбургу сабраўся ўстаноўчы з'езд Усесаюзнай Камуністычнай партыі бальшавікоў. З дакладам "Сучасны момант і нашыя задачы" перад дэлегатамі выступіла Старшыня аргкамітэта бальшавіцкай платформы Ніна Аляксандраўна Андрэева. Гісторыя, здаецца, рушыла ў зваротным напрамку. Нештачка знаёмае, сапраўды, да болю: далёкае, але не забытае, сыходзіла з вуснаў Ніны Аляксандраўны, абранай, поруч з новым ЦК адроджанай партыі, Генеральным сакратаром ЦК ВКП(б). "Дарагія таварышы! Кастрычнік 1917 — зорная часіна народаў Расіі — абвясціў пра пачатак новага этапа ў гісторыі чалавецтва, пра пачатак эры радыкальнага вырашэння сусветнага антаганізму паміж Працай і Капіталам, эры перамогі Розуму над Сілай. І не віна расійскага рабочага класа і яго правадыра — Леніна, што да царства Розуму працоўным прыйшлося ісці са скарыстаннем сілы, ломкай супраціўлення памешчыкаў, банкіраў, заводчыкаў, папоў і купецтва. Стары свет прыгнечання не здаваўся, не ішоў на кампрамісы, і таму пралетарскай рэвалюцыі не заставалася іншага выйсця, як падаўленне і знішчэнне класавага праціўніка, які вёў барацьбу не на жыццё, а на смерць". Чарговы зварот чарговага Генеральнага сакратара з нагоды чарговых, 74-х, угодкаў Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі да савецкага народа. Падобна, гісторыя вырашыла паўтарыць адну са сваіх трагедый, толькі ў выглядзе фарсу. Ізноў "падаўленне і вынішчэнне класавага праціўніка"? Мароз па скуры ад гэтай непарушнай упэўненасці ў святой догме-дамінанце — класавай барацьбе. Ёсць людзі, якія чакаюць новай рэвалюцыйнай сітуацыі? Прыспешваюць яе? Пэўне, каб паўтарыць "зорную часіну". Хто ж ворагі адроджаных рэвалюцыянераў, якія, нягледзячы на прыняты імі зневажальны назоў "гарбастройка", "выйшлі з падполля" (нешта пра іх раней не было чуваць) менавіта з прыходам да ўлады Гарбачова. Ворагі неабальшавікоў — "цяперашнія дачаснікі-антыкамуністы, наступнікі зрынутых рэвалюцыяй класаў, якія па-жульніцку сталі на чале ўлады... Наш патрыятычны і інтэрнацыянальны абавязак — узняць перамаганосны сцяг Леніна, выкінуты апартуністамі і здраднікамі, згуртаваць пад ім камуністаў і працоўных, закласці асновы адраджэння адноўленай Сацыялістычнай Радзімы". Такім чынам, прапануецца яшчэ адзін "адноўлены сацыялізм". Няўжо вы самі, спадары камуністы, не адчуваеце, што няма аніводнага слова з камуністычнага лексікона, якое было б святым для мінулых пакаленняў і якое б не спаскудзілі ў вачах людзей пад час панавання КПСС вашыя ж паплечнікі. Ды й сёння на чале парламентаў 12 былых рэспублік былога Саюза — былыя партфункцыянеры, выхаванцы не "дэмакратаў", а роднай Камуністычнай партыі, дый парламентарыі ў сваёй большасці — тыя самыя "здраднікі" — былыя камуністы, а калі шырэй — дык "здраднікі" ўсе, хто з маўклівай абыякавасцю сузіраў скон партыі авангарднага тыпу. А сузіралі гэты скон даволі спакойна і гегемон-пралетарый, і ягоны саюзнік—селянін, дый вечна рэфлексуючая праслойка — інтэлігент.

Спадара Лапіна, члена ЦК ВКП(б) (Усесаюзнай камуністычнай партыі бальшавікоў), перад вяртаннем з Мінска ў Маскву цікавіла, калі выйдзе матэрыял і ці здолее Маскоўскі візаві ўласнаручна набыць асобнік "ЧЗ". Наш штотыднёвік пакуль (крый Божа) працуе не ў падполлі і штопятніцу легальна з'яўляецца перад кіёскавымі акенцамі. Набыць можна. Дый "усесаюзнай" партыі з та-а-кімі магчымасцямі вышукаць асобнік "ЧЗ", маючы Беларускі камітэт і "таварышаў па партыі" тут, у Мінску, пэўне, не праблема. Таму тэлефонны запыт падаўся мне своеасаблівай дэманстрацыяй сілы, магчымасцей дый жадання паўплываць на змест будучага артыкула (бледны адбітак колішняга перамоганоснага тэлефоннага права?). Хаця, мажліва, я перабольшваю. Калі так, то маё перабольшанне — даравальнае, бо яно — заканамерны вынік "партыйнасці літаратуры", шматгадова ажыццяўляемай Кампартыяй у прэсе.

Так, ёсць людзі, якія чакаюць рэвалюцыйнай сітуацыі, прыспешваюць яе. І можна не сумнявацца, што ў выпадку няздольнасці цяперашніх "вярхоў" палепшыць жыццё людзей, гранічнай незадаволенасці "нізоў" "вярхамі" яны могуць знайсці, дый ужо знайшлі (апошні шматтысячны мітынг у Маскве) спачувальнікаў. Закрываць на гэта вочы, закалыхваць сябе песнямі, што дэмакратыя больш прыцягальная, чым таталітарызм, — мала.

Страшна страціць набытае, страшна не набыць страчанае. Кожны крок аддае рэхам у будучыні. Мы — на хісткім мастку, не скажу, над прорвай (хаця сада-мазахісцкія эпітэты палітыкаў гучаць штодня — катастрофа, бездань, слоўныя перастрэлкі Кіева, Масквы, збройныя — Баку й Ерэвана і г.д.). Усё гэта ўзводзіцца ў неверагодную ступень узаемных пагроз пра яшчэ большыя небяспекі. Перш чым шпурнуць людзей у мясарубку, узважвайце ўсё, палітыкі.

Хто такія бальшавікі? Бальшавікі былі для свайго канкрэтна-гістарычнага перыяду як апазіцыя перш-наперш для царызму — самае паслядоўнае, самае крайняе непрыманне самадзяржаўя. КПСС узнікла на рэштках бальшавізму пасля Кастрычніка й грамадзянскай вайны, яе функцыянальная роля ў грамадстве была зусім іншая — гэта кшталт сярэднявечнага ордэна з інквізіцыяй да іншадумцаў. Без меншавікоў не стала й бальшавікоў у першапачатковым, "чыстым" сэнсе гэтага слова. А для бальшавікоў самым характэрным было непрыманне сацыяльнага паразітызму. Страта гэтай рысы, як вядома, у многім прывяла КПСС да краху.

Сапраўдны сацыялізм — ісцінны незамутнёны апартунізмам існаваў, па меркаванню "нінаандрэеўцаў" да XX з'езда партыі. Тры ж апошнія гады савецкае грамадства зведвала дробнабуржуазны ўплыў. "Ідэалагічнай уверцюрай рэстаўратарскіх працэсаў (сённяшніх, маецца на ўвазе. — ад аўт.) і стала антысталінская кампанія, якая разгарнулася пасля XX з'езда КПСС. Гэта кампанія прывяла да падрыву аўтарытэту сацыялізму, сур'ёзных цяжкасцей у сусветным камуністычным руху, канфрантацыі з Кампартыяй Кітая, да выступленняў сацыялізму ў народна-дэмакратычных краінах Усходняй Еўропы. У СССР прайшла масавая замена партыйна-савецкіх кадраў". І ўсяго толькі падрыў аўтарытэту Вялікай Ідэі. А тысячы бязвінных ахвяр: за што? дзеля чаго?

Апошнім часам зачасцілі на Беларусь "нінаандрэеўцы", "жырыноўскія". Мажліва, Мінск паралельна з асталяваннем у ім каардынацыйнага цэнтра Садружнасці Незалежных Дзяржаў спакваля набывае ролю штаба па ўзгадненню дзейнасці "ўсесаюзных" партый. Падобна ізноў арандуецца славутая цярплівасць беларусоў, якой спаўна карысталіся партакраты, на руку яна й выдаткам дэмакратычных рэфарматараў, аказалася нялішняй і для неабальшавікоў.

"Нінаандрэеўцы" найбольш "чубяць" апошнія тры дзесяцігоддзі сацыялізму. Сталіна не чапаюць. Але сам прынцып адбору прыхільнікаў Вялікай Ідэі і яе адступнікаў той жа, што напачатку перабудовы. Шляхам дыскрэдытацыі папярэднікаў набыць сабе палітычны капітал. Дык, пэўне, гэта тыя ж самыя "прарабы перабудовы", толькі пакрыўджаныя "здраднікам партыі" Гарбачовым, які не апраўдаў спадзяванняў. Такім чынам, абвінавачваючы дэмакратаў у выраканні сацыялізму, нованароджаныя бальшавікі, гаворачы іхнімі ж словамі, "здраджваюць" сацыялістычнай ідэі не цалкам, а выбарачна, кавалачкамі. Усё, што чынілася да XX з'езда партыі, — сацыялізм, пасля яго — дробнабуржуазны ўплыў, апартунізм і да т.п.

Такім чынам, калі сапраўдныя — "канкрэтна-гістарычныя" — бальшавікі бачылі свой ідэал наперадзе, у будучым, то нованароджаным пераемнікам бальшавізму ён мроіцца ў былым. Але гісторыю не перапішаш нанава. Не выхапіш з гістарычнай плыні зярнятка дый скажаш: "Было толькі яно", а мякіну паціху згорнеш у куточак. Было, было й першае і другое. Прычым зярняты без мякіны не ўзнікнуць. Новыя бальшавікі ўхваляюць перыяд ад стварэння РСДРП да 50-х гадоў за найбольшую ягоную адпаведнасць тэорыі марксізму-ленінізму; нацыянальныя дэмакраты ўспамінаюць рэнесансы мясцовай культуры, мовы, дзяржаўнасці; манархісты прагнуць самадзержца, ідэалізуюць царскую дынастыю, дарэвалюцыйную Расію... Ці ж не час сказаць, што ў грамадстве, гэтаксама як у прыродзе, няма тэхнічна-дыстыляванай вады, не можа ўладарыць абсалютна чыстая ідэя грамадскага ладу. Менавіта сукупнасць разнастайных ідэй, шматаблічнасць дае нам непаўторную асалоду рэальнага, не падагнанага пад догму жыцця.

Калі людзі, што называлі сябе камуністамі, спарадзілі сталінскі рэпрэсіўны апарат, застойныя часы, то, пэўне, дарэмна абараняць ідэю й звальваць усе беды час ад часу на праваднікоў Вялікай Ідэі ў жыццё (маўляў, яны не здолелі захаваць чысціню сацыялізму). Сумленна падумаць, ацаніць, што ж усё-такі спарадзіла падгонка грамадства пад ідэю і ці магчыма ўвогуле без страт ажыццявіць хоць адну якую-небудзь, неабавязкова ідэалагічную, грамадскую схему. І не толькі ў голадзе, галоце, нішчымніцы справа. Бяда і ў тым, што спалітызаваная гісторыя, тэндэнцыйнае навучанне ёй абяднілa, проста абакрала нас. Свет людзей і свет ідэй суіснуюць. У спробе ж дакладна да мікрона ўкараніць у чалавечым грамадстве сацыялізм і камунізм, не зважаючы на бясцэнную, незваротную вартасць чалавечага жыцця, бачыцца нейкі працяг барацьбы чалавека з прыродай, з самім сабой, як часткай маці-прыроды.

Спадарства, вы — не бальшавікі. Вы папросту не можаце імі быць, бо для гэтага трэба ні многа ні мала як раскруціць кола гісторыі ў зваротным напрамку на гэту-у-у-улькі гадоў, калі кожнага з вас нат "у планах не было".

Спадарства, вы — не бальшавікі. Вы людзі, якія пацярпелі паражэнне і імкнецеся ўзяць рэванш. Зваротнага шляху няма. Гісторыя з камуністамі сыграла злую штуку. Скінуўшы цара, пераступіўшы праз кроў суайчыннікаў, яны пакрочылі да светлай будучыні, у якой самі аказаліся "на прастоле". Як вынік — зведалі лёс царскай дынастыі. Ці ж не падобныя вінаватасць цара і вінаватасць генсекаў, Палітбюро. І першыя, і другія прыходзілі ў застылую структуру, рушылі ўздоўж наезджанай каляіны. Ідэалізаваць царскую Расію марна, не заўважаць здабыткаў Савецкай улады — несумленна. Бальшавізм — трагічная з'ява, якая вырасла ад расійскіх каранёў, а не таму, што быў такі злыдзень, як Ульянаў-Ленін.

Але вы, спадарства, паўтараю для "нінаандрэеўцаў", не бальшавікі. Хаця б таму, што сапраўдныя бальшавікі заўсёды ўлічвалі гістарычны вопыт, вы ж яго ігнаруеце. Маеце "на руках" 74-гадовую практыку ўвасаблення сацыялізму ў рэальнасць і адмаўляецеся яе ўлічваць. І яшчэ. Калі колішнія бальшавікі пазбаўлялі сябе даброт у выніку барацьбы, то сённяшнія неабальшавікі — найбольш людзі, якія страцілі нешта ў выніку перабудовы. Сёння часам жартуюць пра бальшавіцка-камуністычнае падполле, але ці былі калі-небудзь камуністы не ў падполлі наогул? Уся дзейнасць КПСС, вядомая нам як толькі верхняя частка айсберга, галоўная частка якога была схаваная ў партыйных глыбінях.

Блізасць камунізму да рэлігіі падкрэслівалі і падкрэсліваюць. Але ж былі ў рэлігіі перыяды інквізіцыі і гэта не значыць, што вернікаў стала меней. Былі і застануцца прыхільнікі камуністычнай ідэі, хаця яе заплямілa не толькі кроў "класавага ворага", але і сваіх жа "таварышаў па партыі". Адзінае проціяддзе супраць партыі, схільнай для наладжвання карэнных ломак, — надзейны дэмакратычны лад, шанаванне законаў і павага да іх. "Цывілізаваныя нацыі ўстанавілі дэмакратычную форму кіравання як метад вырашэння ўнутраных супярэчнасцей без гвалту. Дэмакратычная форма кіравання, мажліва, мае ўсе недахопы, што прыпісваюць ёй, але яна мае і адну вялікую вартасць: для большасці людзей яна ўяўляе разумную альтэрнатыву грамадзянскай вайне як сродку вырашэння палітычных канфліктаў". Так меркаваў Бертран Расел, які ў 20-я гады наведаў маладую Савецкую рэспубліку. А наконт веры, у тым ліку камуністычнай,.. што ж, у нас — свабода веравызнання.

Алена Агібалава,
рэдактар аддзела палітыкі, гісторыі і эканомікі.
тэл.39-87-94.

НАША ХРОНІКА

* * *

"ПЕРШАЦВЕТ"– альманах сяброў літаб'яднання "Крыніцы"– падрыхтаваны ў друк і ўжо ўхвалены рэдакцыйнай калегіяй, у склад якой уваходзяць Уладзімір Бельскі (галоўны рэдактар), Алесь Масарэнка (укладальнік і рэдактар выдання), Алесь Пашкевіч (старшыня літаб'яднання), Юлія Алесьніна (сакратар), Уладзімір Клімовіч і Віктар Шніп.

У зборніку змешчаны вершы, апавяданні, абразкі і мініяцюры 52 крынічанцаў. Усе гэтыя аўтары беларускамоўныя.

* * *

Трэба сказаць, крынічанцы не спяць у шапку. Таму-сяму з іх (Юрась Пацюпа, Ігар Сідарук) удалося ўжо выдаць свае першыя паэтычныя зборнікі.

Кнігу паэзіі "Нябесная сірвента", аўтар яе Алесь Пашкевіч, прачытаў вядомы паэт, рэдактар выдавецтва "Мастацкая літаратура" Леанід Дранько-Майсюк і прыняў да друку.

Неўзабаве ў свет у бібліятэчцы часопіса "Маладосць" выйдзе першая кніга прозы Уладзіміра Клімовіча "Сістэма Баслі". У стане рэдпадрыхтоўкі ў гэтым выданні знаходзяцца рукапісы зборнікаў вершаў Аксаны Данільчык "Абрыс скарпіёна" і Валерыя Пазнякевіча "Белае рэха".

Блізкія да завяршэння першыя кнігі паэзіі Юры Гуменюка "Вампіравы вочы", Ігара Карповіча "Менскія санеты", Сержука Мінскевіча "Шкляны кут", Кацярыны Мяшковай "Вока каня", а таксама кнігі прозы Юліі Алесьнінай "Зачараваная арфа" і Міры Лукшы "Дзікі птах – Верабей".

* * *

Творы сяброў нашай суполкі сталі бадай што з нумара ў нумар з'яўляцца на старонках штотыднёвіка "Літаратура і мастацтва". Апошнім часам у гэтым шаноўным выданні, якое святкуе гэтымі днямі сваё 60-годдзе, упершыню выступілі з апавяданнямі Уладзімір Клімовіч і Мікола Касцюкевіч, з вершамі ў прозе – Алесь Давыдаў; чытачы ЛіМа пазнаёміліся таксама з нізкамі вершаў Андрэя Пяткевіча, Алеся Пашкевіча, Анатоля Брусевіча і Валерыя Пазнякевіча.

* * *

24 лютага а 17 гадзіне вядомы мастак Аляксей Марачкін сустрэнецца ў сваёй майстэрні з групай сяброў літаб'яднання "Крыніцы". Таленавіты чараўнік пэндзля і пяра, прызнаны грамадскі дзеяч раскажа крынічанцам пра свае творчыя планы, пазнаёміць з новымі палотнамі і пачытае вершы.

Рада "Крыніц".

ПОСТАЦІ ЛІТАРАТУРЫ

МІХАСЬ СТРАЛЬЦОЎ:

"Кожны па-сапраўднаму таленавіты твор вучыць не толькі таму, як трэба пісаць, але і таму, як не трэба. Вучыся ў выдатнага пісьменніка яго майстэрству, яго глыбіні ў адлюстраванні жыцця, але і вучыся, абавязкова вучыся быць самім сабой, шукай у непадобнасці падобнасць".

С. Н.

Кацярына Мяшкова

КАХАННЕ

Каханне сакавік мінула —
пачатак перадднавальнічны.
І верасень яго малюнак
знайшоў на беразе пшанічным.

На ім закрэслена між небам
і морам хваля далягляду,
і сіняе крыло нясрэбнае
я з постаццю тваёй прыгадваю.

А пералік пяскоў пастэльны
адсвечвае змяненнем твару.
Яго няўлоўная чытэльнасць,
нібы вачэй маіх ахвярнасць.

***

Ты чуў мой голас ручаёвы,
у вуснах выспявалі спевы.
Табе хацелася нанова
пабачыць Бону, каралеву.

Ты бачыў вочы-перазовы —
свята, нібы пасля залевы.
У тваім натхненні каляровым
вужоў я стала каралевай.

Ты меў з маім каханнем змову...
І сэрца — вогненнае дрэва —
адкрыла карані замовы
ператварэння ў каралеву.

***

Бераг — пясчаны каток,
калі адбягаюць хвалі.
Мяне ў танцавальны гурток
паблажліва заклікае.

І вецер бярэ пад руку,
цікаўны да бальнай спробы.
А мой танцавальны тур
настойлівы, як хвароба.

Вада адмывае сляды —
адбітак майго імпэту.
З няздоўжаным танцам тым
на самым краі сусвету.

І роўнядзь пясчаных дзён
з арэхавым мокрым брыжам
маім танцавальным жыццём
была разбуральна ўзвышана.

***

На лузе палосамі скошаны ліпень
і бусел вышуквае пахі рамонкаў.
А тыя згубіліся ў сене вялікім,
абвялі на сонцы іх сціплыя гронкі.

Шпакоў у чароды згуртоўвае лета —
у вырай ляцець ім, далёкі і гонкі...
Пыхлівага жніўня таропкая ветласць
тугі і растання трымае пастромкі.

***

Дзівацкія твары здзіўлялі неба —
ніхто мой сумны настрой не ўлічваў.
І кожная хмарка плыла малебна,
і падалі ў горы маланкі, як знічкі.

Музыкі мелодыі клалі ў кішэні
нястомленых і закаханых танцораў.
Усмешкай вясельнае рэха дрыжэла,
як жартаў тваіх бездакорнасць.

Знайшла навальніца грымотныя дудкі.
Мы танцы ў кішэнях дадому панеслі.
Імгненная ростань, пранізліва-будкая,
згасіла вясельнае крэсіва.

Твой дом з мастацтвам з'еднены.
іспанская палічка,
дзе кастаньеты зведалі
фламенка мазаічнае.
Твой дом з мастацтвам злучаны
гадзіннікам-старэчаю,
які ўжо не агучвае
хвілін сярэднявечча.
Твой дом з мастацтвам сплецены.
На акварэльных конях,
не спыненае лейцамі,
жывых вачэй сутонне.
Твой дом з мастацтвам змушаны
дарыць усім усплёскі
фантазіі закружанай
вышэй звычайнай лёсткі.

***

Танюткі гарлачык у стылі мадэрн
са шкла — вёшнёвае сочыва.
Ён кветкі сабраў знарок на манер
лецішчаў несурочаных.

Сцяблінкі натхнёна глытаюць ваду.
І водарам супакойлівым
у твар мне рахмана і вольна дыхну ў
пялёсткавы голаў мройлівы.

Валеры Пазнякевіч

* * *

Нібыта кардыяграма, скачуць літары.
І раптам — прамая.
Гэта адзіная роўная дарога,
па якой адыходзяць паэты.
Недапісаны радок распяты на паперы.
Незакончаная думка, быццам цвік.
Тут прыбіты сэрца, рукі, нервы.
Тут распяты чалавечы крык...
Непачуты.
Апошні.
Прыжыццёвы.

* * *

Спяшаюся дамоў, бы птушка ў вырай.
Мне надакучыў горад мітуснёй.
Спяшаюся дамоў, нібы на крылах,
дзе ластаўкі шчабечуць пад страхой.
Дзе з коміна дымок увішна ўецца
і пырхае святло, бы матылёк.
Дзе ў ноч глядзіць знаёмае акенца —
працягвае руку сваю здалёк.

Куток мяне вітае пахам мяты,
істужкай свежаскошанай травы...
Ідуць гады, старэюць нашы хаты.
Старэюць людзі, дрэвы і бары.

Ды толькі ў сэрцы песня застаецца,
з якой матуля выпраўляла ў свет,
і весялосць далёкага маленства,
дзе кожны з нас быў творца і паэт.

* * *

На зямным цыферблаце
ёсць дзве лічбы,
якія сочаць за лёсам
чалавечага жыцця.
Адна з іх — дзень народзін.
Другая — дзень смерці.
Першая шчыра ўсміхаецца
і прыносіць шчасце,
не ведаючы пра тое,
што чалавецтва пераступіла яго мяжу.
Я знаходжуся пасярэдзіне —
і адчуваю прыцягненне абедзвюх.
Магчыма, я падуладны маятніку...

* * *

Віктару Цою

Мне сёння сніўся сон,
я зноў ішоў спяваць.
Наўкол натоўп людзей,
гітара — пад рукой.
І я ўсміхаўся ім,
хоць сам хіліўся спаць.
Я зблытаў дзень і ноч —
парушыў свой спакой.

Хацеў узяць акорд,
ды абарваў струну.
Хацеў вам песню спець,
ды мікрафон згарэў.
Напаўакорда ўзяў —
паклаў сябе ў труну.
А хтосьці рваў квіток
і немачна глядзеў.
Змаўкае сэрца бой,
бялее маскай твар.

А люд крычыць: "Спявай,
чаго ж ты раптам змоўк?"
Чувац апошні ўздых.
Губляе цела жар.
І адляціць душа,
зрабіўшы зорны крок.

* * *

Светлы позірк тваіх вачэй
маё сэрца пяшчотай грэе.
У цішы залатых начэй
я знаходжу сваё натхненне.

Светлы позірк тваіх вачэй
параўноўваю з промнем сонца.
Ты са мною.
І мне лягчэй
па дарозе ісці бясконцай.

Светлы позірк тваіх вачэй
адчуваю ў памеры верша.
Дай мне моцы кахаць яшчэ,
дай мне моцы не здрадзіць першым.

Светлы позірк тваіх вачэй
тоіць нешта ў сабе святое.
Уночы свечка гарыць ярчэй
і яе не заліць тугою.

ЛЯСУН

Вось ён гайдаецца на дрэве
і насміхаецца з людзей.
Ён пры жыцці не спіць, не дрэмле —
таму згубіў уласны цень.

Яго завабіш толькі свістам,
тады ён выпаўзе на пень,
зацягне песню. І ўрачыста
адзначыць свой вясельны дзень.

Малыя дзеці, лесуняты,
пастануць дружна ў карагод.
А лесуніхі з траў і мяты
пачнуць варыць вясельны мёд.

Алена Кліменка

Сумленне падказала

Абразок

Ля крамы Слаўка знайшоў пакамечаны рубель і хацеў быў купіць сабе што-небудзь смачнае, але неўзабаве пераканаўся, што за рубель ужо нічога нельга купіць, нават марожанае. Вяртацца дадому з чужым рублём ён не хацеў: маці пачне распытваць, дзе ўзяў, навошта браў, калі не твае грошы...

І Слаўка заціснуў рубель у кулачок, падняў руку і стаў гучна выкрыкваць:

– Хто згубіў грошы?! Хто грошы згубіў?!

– Я згубіў,– тут жа паўстаў перад ім няголены, у падзёртым палітоне дзядзька ...
ўзросту.

– Колькі?!– не ...
Слаўка, хоць і пабойв...
дзядзькоў, брыдкіх і н...

– Дзесяць рублёў, п...

– Не, пяцёрак тут ...
нуў Славік кулаком.– ...
згубіў?!– зноў выгукнуў...
у бок ад мужчыны.

– Я згубіла трыццац...
тоненька, як мышка, ...
маленькая дзяўчынка з ...
косках.

– Капейкамі ці рублё...
з тропу Слаўка.

– Капейкамі... Дзве п...

– Не, трыццаці ка...
знаходзіў.

– А ў мяне... шапк...
падышоў да Славіка цы...
шакласнік.– Ты часам ...
шоў?..– працягваў ён в...

– Хлопчык, а ты ...
чорнага коціка?..– спын...
лая жанчына ў акул...
шкельцы якіх яе вочы ...
ныя на дзве жаўтабокі...
Збег некуды мой коцік...
як вугалёк, а на лбе бел...

Да Слаўкі ўсё падых...
і новыя людзі. І кожны...

– Што здарылася?..

– Хто згубіўся, кот...

І тут падышоў худ...
слуп, мужчына з востр...
гнусява галёкнуў:

– Трэба выклікаць мі...
малы, а ўжо крадзе!..

Бедны Слаўка ...
выплішчыўся з натоўпу...
кулачок, а там – пуст...
ён выпусціў рубель – ...
Здзівіўся: "Куды ён ...
рубель?.. Я ж так мо...
яго".



Міра Лукша

Апавяданні

Бабка Тахвіля

— Даволі добра мне жывецца, панства дапамагае. Ці многа ўжо старому трэба?.. Абы крыху перакусіць, абы ў целе дух трымаўся. На мяса зубы ўжо застарыя. Пратэза, праўда, е, але сам рот так ужо зжаваўся, што штучныя зубкі сталі завелькі. Хіба што толькі да труны пад падушачку хай уложаць — чаго маюць зубы аддзельна валяцца, калі мне будзе пара ў пясок?.. Э-э, нахадзілася па свеце за сваё жыццё, натапталася. Не адны чаравікі здзёрла і калошы, валёнкі... Калісь то самі валёнкі валялі, цяпер купныя — не такія... Са снегу, бывала, ледзьве выкапаешся, але ў ногі цёпла! Ды і ногі цяпер не тыя... Цяпер, калі б маладая была, то ніякімі аўтобусамі нікуды не дабіралася б — што прабегчы тых пару кіламетраў, чаго грошы збываць? Сёння ж чалавек без самахода не можа — смуродзіць паветра, гатоў нават за патрэбай ехаць на машыне! Ага, кожны пан, і панаваць хоча перад людскімі вачыма. А чым вялікшы пан — тым менш ходзіць, і жывот у яго ўсё большы і большы, сапраўдны, а калі ўжо няма як праз гэты жывот за рулём сядзець, то тады ў такога пана ўжо службовы кіроўца, а пан на заднім ужо сядзенні — два месцы займае. Але што праўда, то праўда — жывот патрэбны, калі чалавек на высокай пасадзе. Адразу бачыш — які важны пан. Калі б і захацелі яго адтуль выкінуць, з-за гэтага стала, то цяжка — важыць жа нямала! А ў каго жывот вялікі, у таго і голас найчасцей адпаведны. Колькі разоў мне прыходзілася стаяць перад такімі жыватамі! І да вайны, і пасля. Але калі нават ён на цябе і накрычыць, то ведаеш, што ты сам высока дайшоў! Голас такі грамаўладны! Але цяпер нарабілася малых панкоў. Малыя ў іх самаходзікі, бо ўсё ж кожны жывоціка наперад выпіхае. Не тыя паны, што калісь!.. Цяпер, пакуль дойдзеш да самага важнага, то пападрыпаеш ад століка да століка ўсялякіх паненак, што то не маюць ні на чым сесці, ні чым дыхаць, бо мораць сябе голадам, каб у модную шмотку ўлезці, і толькі што каву п'юць і дыхаюць дымам з цыгарэтаў. Не кажу, што яны, гэтыя паненкі, непатрэбныя, не! Для ўлады патрэбная павага, і, каб уладу шанаваць і цаніць, трэба знаць сваё месца. Калі б ты адразу трапіў да найважнейшага пана, проста з вуліцы, то не шанаваў бы ні яго часу, ні ўвагі. Заходзіш і кажаш, чаго табе трэба, а ён адразу скажа "так" або "не", а можа, шчэ й будзе тлумачыцца?! А табе і так, калі сваё адчакаеш і находзішся, куды трэба, дадуць табе паперку ўздоўж і ўпоперак у пячатках і подпісах, і ведаеш, што ўверсе сказалі "так" або "не". Быццам твая паперка па якойсьці вяровачцы да самога Бога і назад вярнулася, а табе трэба было толькі значкі купіць!..

Сабе хату залатвяла. Адзін пакойчык цяпер маю, а нядаўна мела свой драўляны домік. Цяпер там блокі будуюць. З мае хаткі не засталося ні трэскі, яблынькі выразалі... Праўда, дрэўцы былі павыкручаныя ўжо ад старасці, як і я сама, але вясною яшчэ зацвіталі...

У Зяўровачцы павечарэла...

Людзі канчалі ўпраўляцца. Каля вясковага клуба пачала збірацца моладзь — у пятніцу з цягніка спяшаліся вучні з сярэдніх школ з суседняга горада.

Васьмікласнікам, як і ўсім вучням пачатковай школы ў Зяўровачцы, бацькі не дазвалялі лазіць па цёмных вулачках пасля дваццатай, усё ж часта выстойвалі яны пад святліцай, заходзілі па пяць разоў купіць пачак мятных гарошкаў ці цыгарэт "для бацькі" (махорку прасілі ўсё больш адкрыта, прапахлыя танным дымам), не тоячыся перад настаўнікамі. Іх, настаўнікаў, жыло ў вёсцы толькі чатырох, што тут паўжаняліся на тутэйшых дзяўчатах, рэшта даязджала цягніком у Гайнаўку, дзе мелі свае кватэры ў блоках і сваіх дзяцей-старшакласнікаў, якія менавіта тут, у Зяўровачцы, скончылі пачатковую адукацыю. Настаўніцкія дзеці вучыліся па ліцэях, адна толькі Караліна хадзіла ў сельскагаспадарчую школу, хаця Эдгар, яе бацька, статны сівы фізік, позна пабраўшыся з Ганнай, настаўніцай па біялогіі, займеўшы дзяцей, захацеў выправіць іх на людзей, а тут дзеці простых сялян мелі пераскочыць яго Караліну.

Дачка вельмі ж цягнулася ў гэту вёску, з якой з палёгкай кожны падвячорак выязджаў стары настаўнік Эдгар, па дарозе на чыгуначную станцыю ледзь ахаланаючы ад дзіцячых крыкаў на перапынках і сляпой злосці на зацятае, тупое маўчанне і блуканне па столі вачэй вучняў, да якіх не даходзілі простыя і ясныя правілы фізікі.

Ён ненавідзеў гэту дарогу. Дачку часта сустракаў, калі тая з парай дзяўчат са свае школы ехала з горада на вясковую дыскатэку ў Зяўровачку. Сорамна было крычаць на Караліну пры чужых, і ён пагрозліва глядзеў дачцэ ў нахабныя вочы, адбіваў жа ўсё дома, у суботу ці нядзелю, калі дзяўчына паяўлялася раніцай, сонная і змучаная.

— Не чапай мяне, тата, не згадвай мне, што я — дачка настаўніка! Я маю права так паводзіць сябе, як хачу. Дома буду сядзець, калі буду такая старая, як ты... І так не маеце са мной бяды! — Караліна вяла разувалася са стаптаных туфляў у вітальні, бразгала дзвярыма ў ванную, напускала сабе поўную ванну вады і мокла гадзіну, гартаючы каляровыя часопісы.

Маці моўчкі рыхтавала сняданак, сядалі за стол. Так, яна шмат размаўляла з бацькамі сваіх вучняў пра тое, як пазбегчы вынікаў "канфлікту пакаленняў", як трэба асцярожна даходзіць да душы маладога чалавека, каб мець удзел у яго станаўленні, але, нічога не паламаўшы, сама з вялікімі цяжкасцямі магла весці размову з дачкой.

Малодшы сын, Патрык, быў больш даступны, не меў праблем у кантактах ні з бацькамі, ні з сястрой, хаця тады, калі дзеці былі малыя, панавала між імі зайздрасць за бацькоўскія да іх пачуцці. Цяпер без праблем дзяліліся відэакасетамі, мяняліся вопраткай, размаўлялі, але калі паяўляўся нехта з бацькоў, моўклі, не глядзелі яму ў вочы.

— Маеш да нас якую справу? — кідала тады Караліна і не чакала адказу.

Сёння ў Зяўровачцы зноў вечарэла. Людзі канчалі ўпраўляцца. Стараліся хутка ўсё парабіць, памыцца крыху і бегчы пад святліцу. Штораз радзей туды заходзілі. Стаяла гэта святліца дваццаць гадоў, пабудаваная грамадскім пачынам, яшчэ на хвалі пасляваеннай адбудовы краіны, і гніла. Знайшлося колькі шалёных асобаў, даў начальнік гміны драўніну, і святліца пасвятлела. Пару гадоў не зачыняліся тут дзверы, але потым нечага ўсё заглухла. Можа, тыя шалёныя пасталелі?

Праўда, ключы да дзвярэй у хлопцаў ёсць, і калі ўжо вельмі хочацца патанчыць, нават і штотыдзень можна дыскатэку рабіць, абы дазвол з гміны быў, але ўсё ж не тое, каб было што ўспамінаць. Дыскатэка — не вясковая забава, з "аркестрай", з півам, як у найлепшыя часы, з "чыклядным вальсам"!.. Такіх забаў можна пашукаць у суседніх гмінах, хоць бы і ў Гарадку (ды і там ужо не тое). Селяніну цяпер не да забавы. "Тут плакаць трэ, а не гуляць", — кажа Вася Скоблікаў. І п'е. Кожны дзень п'е, бо што ж зробіш, калі баба не дагледзіць. А адкуль тую бабу ўзяць? Нап'ецца Вася, гатоў разнесці хату, на мацеру руку падымае, але калі цвярозы — добры такі, хоць да раны прыкладвай. Раз так выпіў, аж плакаў, а потым схапіў калок і па вяргінях, па вяргінях матчыных — усё пабіў! Крычаў: "Нашто нешчасліваму прыгажосць?! Хай пропадам прападзе!". Знішчыў такі кветнік, найхарошшы ў вёсцы!

У Зяўровачцы — сёння свята. "Грамада" аж з Віцебска прыехала! Праўда, аб'ява вісела толькі дзень — на сцяне ў злеўні малака, каля "жалезнай" крамы, на пошце і на счарнелых дзвярах святліцы, нядаўна яшчэ смаліста-жоўтых. Першыя на канцэрт паявіліся бабулькі, каб заняць месцы на крэслах, што асабіста выцер ад пылу сухой анучкай "грамадоўскі" бубнач-украінец. Прыйшоў і Коля Адрыголец, але не кінуў ні залатоўкі на новы "грамадоўскі шпшэнт", бо стары сыпаўся не менш, чым струхлелыя масніцы "сцэны".

— Не маю грошай сабе на піва, то ім буду грошы кідаць? Паслухаць-то магу! — і затупаў казака.

Разварушыліся зяўроваччанскія людзі.

— Аж плакаці хочацца — так даўно да нас ніхто з канцэртам не прыязджаў! Эх, "Лявоніху" б нам яшчэ раз перад смерцю пабачыць, пачуць! — уздыхнула баба Юлька.

Ляцяць над Зяўровачкай гукі музыкі, здалёк сапе чыгунка... Пад святліцу, на мураўку, якая густа ўзеляніла даўней вытаптаны падворак, усё заязджаюць машыны...

Караліна прысела на плоце. Каля яе гайнаўскі хлопец. Не раз з ім танчыла цэлую ноч. Праўда, пра яго сур'ёзна думаць нельга — мяняе дзевак як пальчаткі, бо і грошы мае. А дзе ж ён працуе? Цяпер нямодна пытацца пра такія справы. Сёння ён нейкі неспакойны, быццам кудысьці спяшаецца.

— Хадзем пагуляем... — прапануе кавалер несумненна прыемны шпацыр у бок дыхаючага блізкай восенню ўзлеску.

Потым Караліна пойдзе да сяброўкі спаць. Людзі паслухаюць музыку, хто паскача, хто вып'е за рогам з Васем кропельку самагонкі ад Мальвінкі...

А раніцай у царкве заўважаць, што прапалі тры старыя абразы і келіх, а цудоўнай работы заўровацкага каваля клямка ад варот памазана нейкай поскуддзю.

Зноў абрабавалі Зяўровачку. Бяднее яна. Божа мой, як бяднее.

дзька няпэўнага
не разгубіўся
пабойваўся такіх
кіх і няўклюдных.
блёў, пяцёркамі...
тут няма,– мах-
ком.– Хто грошы
ыгукнуў і адступіў
ны.
прыццаць капеек,–
ышка, прапішчэла
ынка з банцікамі ў
і рублём?– збіў яе
Дзве пятнаццаткі.
цаці капеек я не
шапка прапала,–
віка цыбаты стар-
часам яе не знай-
аў ён выскаляцца.
а ты не бачыў
– спынілася пажы-
ў акулярах, праз
е вочы былі падоб-
ўтабокія слівіны.–
й коцік... Ён чорны,
лбе белая плямка...
падыходзілі новыя
кожны пытаўся:
лася?..
ся, кот?
оў худы, доўгі, як
востым носам і
ў:
каць міліцыю!.. Такі
адзе!..
ўка – ледзь
атоўпу. Расшчапіў
– пуста. Як і калі
ель – не помніць...
ы ён мог дзецца,
лак моцна трымаў

Нашы рэцэнзіі

Восень кароткага, адвечнага часу

Сяржук Мінскевіч

Вецер. Не рэзкі, сцюдзёны, мудры. Мерныя хвалі. Белыя. Шэпт і музыка. Ціхая, здалечы. Шапэна? Трагедыйная і пранікнёна-лірычная. Восень. Святочная, маркотная, жаночая. Восень лета, зімы, вясны... Белыя і "празрыста-чорныя", жоўтыя і блакітныя мазкі бясконца зменлівай карціны абстрактнай ці канкрэтна-класічнай...

Свет адчуванняў, які стварае вакол чытача Таццяна Сапач. Нават звычайная назва кнігі "Восень" — само слова восень — падсвядомым успрыманнем атрымлівае іншы сэнсавы (метабалічны) план. ВОСЕНЬ (ВАКОЛ СЕНЬ часу). Часу, што сцякае, сцякае, сцякае. Яму падуладны думкі, настрой, каханне, Я!

Як незвычайна і відавочна, складана і проста паказваецца змяненне бясконцага і замкнутага ў вечнасці часу, і мы — адносна яму, у вершы "Надыдзе снежань...".

Снежань змяняе восень, "адменіцца і дзень, і свет, і дом". А ў люстры жыве мастак павук (час), які змяняе, старыць нас. Як спыніць яго!

...і я прыцісну мастака да рамы —
брунатнай рамы, грубай і старой.

Але выніку няма, і турбуе пытанне, у адказ на якое кола замыкаецца:

...Што будзе потым? —
будзе ведаць снежань,
які пабеліць мой самотны дом
і намалюе ў люстры павука,
што дзень і ноч бязбожна выплятае
бязважкія карункі і ўзоры
на твары тонкім, чыстым і ўрачыстым,
знаёмым, так... — і, можа быць, маім...

Вельмі парадаксальны, асабліва для мужчынскага, больш паслядоўнага разумення, кругазварот часу, які прагназуецца памкненнямі жаночай істоты да каханага (сябра) у персанальных (а, можа, гэты вобраз абстрактны) вершах Савелію. Умоўна будучы час: "ты раптам прыгадаеш", ён (можа быць) прыйдзе — пераходзіць у проста будучы: сустрэнемся, "ты спытаеш" — пераходзіць у цяперашні: мроіцца размова, я кажу, "брама не пускае" — пераходзіць ва ўмоўна мінулы (ці бо зараз павінна зрабіцца мінулым, ці ўжо робіцца мінулым): я не люблю вас (не любіла ў гэты момант, бо вы ўжо прыйшлі), "цябе даўно ведаю, праходзь", "зайдите, товарищ, завтра" — сёння ўжо прайшло. А ўмоўна мінулы час дамневае і дапускае ўмоўна будучы. Атрымліваецца: ты, можа, прыйдзеш; прыйдзеш; прыходзіш; прыйшоў — можаш ісці, але, можа, прыйдзеш... Тут вельмі праўдзіва выпісана залежнасць Жанчыны ад часу (моманту) дзеяння.

Таццяна Сапач шчыра раскрывае, агаляе непастаянную і, як парадокс у непастаянстве, заканамерную душу сваёй лірычнай гераіні (сябе). Душа яе, нібы асенні, праглядны наскрозь лес з апалым лісцем.

Дрэва, поўнае зроку,
сцяжына, поўная слыху —
насуперак сну і страху,
насупраць святла і лёху —
і гэта,
здаецца,
я...

Форма вершаў быццам балансуе на ледзь прыкметнай грані паміж рыфмаванымі і белымі. Верлібры рытмізаваныя — большасць вольны амфібрахій, што надае плаўнасць і нараджае адпаведную інтанацыю. І таму не згаджаешся з самой паэткай, калі яна ў вершы "Вецер" кажа:

А я наступаю на горла
мудраму беламу вершу
і вызваляю з формы
дзікі звярыны крык:
я не хачу волі!
я не баюся кайданаў!
я не памру ад самоты,
мой паратунак — тут!

Мова вершаў прыгожая і мілагучная (ніякі не крык). Радкі спяваюць і нават у літаральным сэнсе. Верш "Мы — дзеці чорнага горада" стаў песняй, пакладзенай на музыку К.Камоцкай.

Узбагачаюць моўную думку нечаканыя параўнанні, вобразы:

...вясёлая варта
кароткіх шчаслівых хвілін...
...бязлюдныя выспы кавярні...
...і неба яшчэ не купалі ў зялёных шатах...

Напрыканцы, падвынікуем, што кніга Таццяны Сапач "Восень" — душой ранімай створаная кніга. І які боль працінае, калі адчуваеш, як уздрыгвае падараваны нам свет гэтай душы пад тупа бадзяльнымі статкамі прыслугачоў ваяўнічай абыякавасці.

"Але нам не дадзена іншай Радзімы"... — кажа паэтка.

Але нам не дадзена іншай Радзімы — усведамляе кожны, хто не са статка!

І толькі калі адчуваеш сапраўдны фізічны боль, разумееш парадокс, вызначаны Таццянай Сапач:

І можа таму, што жыццё,
нібы міг, кароткае,
на беднай,
на вечнай Радзіме
жыве чалавек.

Сапач Таццяна. Восень: Вершы. Мн. Беларуская асацыяцыя дэтэктыўнага, прыгодніцкага і палітычнага рамана, Беларускае таварыства «Кніга».

Наш альбом

...Ой у лесе, ой у лесе
Я сустрэла цябе, мой Алесю.
Ой у полі, ой у полі
Я сустрэла цябе, мой саколе...—

спявае **Ніна Загарэўская.**

Яна піша вершы і прозу. А таксама — аўтар шматлікіх песень як на свае словы, так і на тэксты іншых паэтаў.

Нарадзілася Ніна Альбертаўна ў вёсцы Мікалаеўшчына, вучыцца ў Брэсцкім педінстытуце.

Людміла Рублеўская

Калядныя вершы

1

Ззяла зорка над начною пусткай,
Быццам першы залачоны цвік.
Аблачыны падалі, як руты,
Прыглушалі немаўляці крык.

"Аве! Аве!" — птушкі праспявалі.
"Аве!" — адгукнулася зямля.
Паўтарала ўсё жывое: "Аве!"
І ў хляву заснула немаўля.

Ну а людзі выбягалі з хатаў,
На балконы выбягалі віл,
Зорку вязні бачылі з-за кратаў,
Бачылі нябожчыкі з магіл.

"Быць вайне!" — няшчасныя шапталі.
"Цар памрэ!" — багатыя раўлі.
А аблокі мякка ападалі
І стваралі руты на зямлі.

І святло, запаленае ўночы,
Бачылі нямногія яшчэ...
...І ў хляву заснуў маленькі хлопчык
Пад сузор'ем матчыных вачэй.

2

Сёння ўночы народзіцца Бог.
Сёння днём не змяніліся людзі.
І валхвы не пратопчуць дарог
Да Марыі па мерзламу бруду.

Я люблю гэты час, і мароз,
Востразорае неба, і шэпат
Аблачын, і няпэўны свой лёс,
І далоні, узнятыя ў неба.

Сёння ўночы народзіцца свет.
П'е гарбату наш госць выпадковы.
Хутка пойдзе — і выстыне след,
І развеюцца горкія словы.

Пра талоны, пра чэргі і сум,
І пра тое, што добра сабрацца
І аднойчы пайсці б у царкву,
Ці палатку паставіць на пляцы.

Словы, словы, частункі душы.
Б'е гадзіннік. Да поўначы блізка.
Толькі ў полымі свечкі дрыжыць,
Як пялёстак, блакітная рыска.

Хутка, хутка народзіцца Бог.
Прыйдзе любасць хаця б на хвіліну.
Хто хацеў дараваць — і не змог,
Сэрца ў свеце мінулым пакінуў.

Хто не ўспомніў пра свята — сляпы.
Мітусня, хлеб штодзённа — не вечнасць.
Сёння горад — ад зор залаты,
Віфлеем — у каляднай цямнечы.

3

Віхураў час. Любая квецень тут
Імгненна аблятае дням пад ногі.
Але валхвы ідуць, ужо ідуць,
І зорка ззяе ўздоўж святой дарогі.

А над дарогай круціцца віхор,
І крышацца пад ім людскія справы,
І цар памерлы, уваскрос, і зноў памёр,
І на крыжах вісяць адны Вараравы.

А зорка праплывае горад наш,
Далей, далей, праз каламуць і сцюжу,
І неба прада мною — як сцяна,
І вецер мне рагоча прама ў вушы.

Не наша бласлаўляецца зямля.
Не нам выратаваўцу біць і вешаць.
Вятры пыляць і вьюць, і пыляць,
Валхвы ідуць.
А мы галосім вершы.



Віктар Шніп

* * *

Рыпучыя дрэвы, дрыготкія цені
І вецер сцюдзёністы ў парку старым.
Цяпло ад кастра невясёла струменіць,
Нябёсы над горадам — хмары і дым.

Хаджу сярод клёнаў, лісцё падбіраю
І думкі дурныя вярэдзяць душу.
І травы пад лісцем сухім паміраюць,
На мёртвыя травы самотна гляджу.

На дрэвах сядзяць, як святыя, вароны,
Цікаўныя вельмі, цікуюць за мной,
Нібы я нясу залатую карону
Вароне крыклівай — царыцы лясной.

А мне ўжо абрыдла ўсё ў горадзе гэтым
І праца, і чэргі, і нават сябры.
І лета было, ды не бачыў я лета.
Я раннюю восень палю на кастры.

Прыпомніў ізноўку: быў вольным калісьці...
І буду я вольным не толькі што ў сне!
Кідаю ў агонь адшумелае лісце
І дым абдымае, як брата, мяне.

* * *

Чорны крыж ля дарогі стаіць,
Чорны крыж у нябёсах ляціць.
А іуда цалуе ісуса,
А іуда прадаў беларуса.
І за грошы іудавы — пір,
І паўнюткі крывёю пацір.
Шумна рабства святкуючы, людзі
Век жывуць, нібы свінні, у брудзе,
Паміраюць ад гора, нястач.
Паміраеш, ды толькі не плач,
Дзякуй Богу, што ў Ноч адплываеш.
Забіваеш Хрыста, забіваеш
Кожным крокам сваім да крыжа
І маўчыць, нібы камень, душа.
І крычыць над Айчынай цямнеча,
І ў цямнечы гняздзіцца пустэча.

У скляпенні

Жывуць у скляпенні бяспраўныя людзі.
Як сонца засвеціць — выходзяць на свет.
І па-гаспадарску ля сметнікаў блудзяць,
Шукаючы пляшкі пустыя ў траве.

Гавораць з варонамі і галубамі,
Шкадуюць бяздомных сабак і катоў.
Ля гэтых людзей мы праходзім панамі,
У іх мы не бачым сясцёр і братоў.

Бяспраўныя людзі, бяздомныя людзі
Ад нас адплываюць штодня на клады.
Таксама мы гінем у блудзе, у брудзе,
Ды толькі чамусьці не бачым бяды.

І бюсты герояў валяюцца ў травах...
І мы ўсе жывём у бязбожнай начы...
Мы волі жадаем. І наша дзяржава
Трымаецца Бог яго знае на чым.

На забытых кладах

Толькі цені прыходзяць з Нябыту
Па сцюдзёных прыступках капліц.
Цені ходзяць па цэгле разбітай
І па шкле. Ім нішто не баліць.
Ды шкада ім забытага Храма,
Ды шкада ім забытых магіл.
А за плотам смярдзючая яма
І дарогі атрутлівы пыл.
Ходзяць моўчкі журботныя цені,
Як грахі нам даруюць — смяцце.
Перад імі нам стаць на калені
І праклясці б сябе і жыццё
За кароткую памяць і здраду,
Здраду родным і блізкім сябрам.
Мы — у чэргах жывём па зарплату,
Мы — у чэргах гібеем ля крам.
Нам здаецца — мы вечныя людзі,
Толькі вечнасці нам не спазнаць.
Крыжык б‘ецца аб хворыя грудзі —
Як ахвота сябе ўратаваць!
Да царквы мы прыходзім разбітай,
Каб прад Богам упасці ўсё ж ніц...
Ды насустрач не выйдуць з Нябыту
Нават цені з забытых капліц.

* * *

Ці то вецер гудзіць, ці то ведзьма ляціць,
У нябёсы з дарог, уздымаючы пыл.
Ці то сонца ўзышло, ці то неба гарыць
Над шумлівасцю ніў, над спакоем магіл.

Тут у студнях даўно амярцвела вада
І сабакі ваўкамі зрабіліся тут.
І такая навокал пануе жуда,
Быццам Божы цяпер пачынаецца Суд.

І нікому цяпер даравання няма,
І не будзе ніколі — на роднай зямлі,
Бо разбураны Храм, бо ў законе турма,
Бо сябе прахіндзеям за грош аддалі.

Толькі воран крычыць, толькі сэрца баліць
Над шумлівасцю ніў, над спакоем магіл...
Гэта вецер гудзіць, смерць сляпая ляціць
У нябёсы з дарог, уздымаючы пыл.

ПОВЯЗЬ

Сёння госць гэтай рубрыкі – Уладзімір Жылка. Гэты чалавек з'явіўся на свет на самым пачатку 20-га стагоддзя, у 1900 годзе. Кропелька Беларусі – нясвіжская вёска Макашы – стала радзімай паэта. У 1914 годзе разам з бацькамі ён пераехаў у Менск. У сувязі з хваробай (сухотамі) лёс закідвае Жылку ў мястэчка Гарадзея, якое пасля заключэння ганебнага мірнага дагавору апынулася пад Польшчай. З Гарадзеі сваякі накіроўваюць Жылку ў Вільню, каб той атрымаў хоць якую адукацыю. Затым – чэшская Прага, вучоба на гісторыка-філалагічным факультэце Карлавага універсітэта.

Друкавацца Жылка пачаў з 1918 года. З першых ягоных вершаў трэба назваць верш "Покліч":

Пад штандар бел-чырвона-белы

Гуртуйся раць, адважна, смела,

Адважна-храбрых ваяроў...

У гэтых хай сабе і не дасканалых радках выявілася нацыянальнае аблічча Жылкі. Апрача нацыянальна-адраджэнскіх, у яго творчасці гучаць філасофскія, пейзажна-лірычныя, інтымныя матывы.

1926 год. Акадэмічная канферэнцыя па пытаннях мовы. Жылка прыязджае ў Менск і застаецца жыць у Савецкай Беларусі. Працуе ў розных беларускіх выданнях.

Узвышэнца Жылку непрыхільна сустракае "бураленная" бальшавіцкая крытыка. Вось адзін з тагачасных водгукаў на ягоны верш "Меч" на старонках часопіса "Маладняк" (1928): "У сувязі з ідэалізацыяй "прошласьці слаўнай" роднага краю стаіць і захапленьне (Жылкі. – А.П.) наогул усялякай гістарычнай стар'ёўшчынай, аж да архэолёгічна-клясычнай старасьветчыны. Вынікае-ж гэтае захапленьне часткаю з рэакцыйнага праклоненьня перад усім старым наогул, часткаю – з прывычкі да трунакапальніцтва...". Надыходзіць 1930 год. Жылку арыштоўваюць адным з першых і асуджаюць на 5 гадоў высылкі ў Вяцкую акругу, дзе паэт і памёр у няволі 1 сакавіка 1933 года.

Алесь Пашкевіч.

Уладзімір Жылка

МЕЧ

Яго ў зямлі знайшоў маёй разлогай,
Гаручы прадзедаў вузкі загон.
Вясёлым звонам аказаўся ён,
Калі чапіў яго канцом майго нарога.

Абцёр набожна іржу часу былога,
І заблішчэў старых стагоддзяў сон,
І надпіс на клінку, нібы закон, —
"Да рэшты бой!" — зірнуў загадам строга.

І вось няма нясмеласці, разваг.
Для сэрца вернага — чужынцам страх:
Радзімы сховў вартуйце, маткі, сёстры!

Я з грамадой іду па шчасце нам.
Мой меч зіхціць непераможны, востры.
Змагуся сам — так сотням перадам!

* * *

Душа мая тужлівая
Лілея між балот.
Узрасла яна, маўклівая,
У багні сонных вод.

Ёй сніцца неба іннае,
Дзе сонечна вясна,
І песняй салаўінаю
Атручана яна.

І нешта патаённае
Шапоча родна ціш,
І ў ночы цёмна-цёмныя
Чаруе зорна выш.

Наўкола ж ціна брудная
І плесня й гідкі пах,
Чыесьці ўздохі трудныя,
Нуда і нейкі жах.

І штосьць незразумелае
Шуміць-пяе чарот,
Чаго не пойме белая
Лілея між балот.

ПАЛІМПСЭСТ

Ёсць рукапісы, змест якіх сцярты ледзь знаць
Ці на'т другі напісан сэнс бязбожна.
Іх палімпсэстамі прынята здаўна зваць,
І першы іхні змысл пайме не кожны.

Краіна родная! Так сталася й з табой.
Багацце й хараство твае прыроды
І прошласць слаўную змяшаў чужак з грязёй
І словы вывеў гідкія для зводу.

Але народны дух, разбіўшы мур турмы,
Здалеў вяковы бруд паганы змесьці.
І з дзіўнай любасьцю чытаем тое мы,
Што захавалася на палімпсэсце.

ПЭНТАМЭТР

Келіхі, сябры, паўней! Асыпаюцца яблыняў кветы,
Гіне вясны хараство — бела-ружовы ўбор.
Дзеці ўздыхаюць па ім, але Мудрага яснасць няўзрушна;
Там, дзе распукваўся квет, к восені выспее плод.
Келіхі, сябры, паўней! Час прызначаны кожнай праяве:
Моладасць прочкі імкне. Сталасьці прыйдзе чарга!

Рада "Крыніц" працуе па панядзелках з 15 да 20 гадзін у грамадскай прыёмнай штотыднёвіка "Чырвоная змена" (Дом друку. Праспект Ф.Скарыны, 77, пакой 112, першы паверх). Тэл. 32-65-46.

Літаратурны выпуск "Крыніцы" вядзе пісьменнік Алесь Масарэнка.

ТАКОЕ ЯНО, ЗАМЕЖЖА

Так атрымалася, што амаль усе мае вучні пабывалі ў гэтым годзе за мяжой на аздараўленні. Лепш, праўда, сказаць "на азнаямленні з навакольным светам", бо геаграфія іх уяўленняў аб замежжы звужалася рамкамі падручнікаў. А што можна даведацца з гэтых вучэбных дапаможнікаў, якія даўно і безнадзейна састарэлі? Што ў краінах Захаду пануе загніваючы капіталізм, людзі пакутуюць ад голаду і холаду, беспрацоўя, бедныя жывуць у трушчобах...

Дзяўчаты мае прывезлі шмат уражанняў. Прапаную вашай увазе вытрымкі з іх сачыненняў.

С.К. Прыбылі ў вёску Аберталь. Размясцілі нас у школе, дзе адпачываюць нямецкія дзеці. Будынак вялікі. У ім ёсць усё для адпачынку: майстэрня, памяшканні для гульняў, тэніс, кегельбан і інш. Сталовая вельмі акуратная. Усюды чыста, утульна, посуд зручна размешчаны. Ёсць піяніна.

Мы шмат чаго ўбачылі. Наведалі заапарк, паліцыю. Паліцэйскія паказалі нам сваіх сабак, свой духавы аркестр. Бачылі іх машыны з камп'ютэрнай тэхнікай. Запрашаў да сябе ў госці міністр гэтай зямлі. Былі ў бургамістра, распісаліся ў залатой кнізе — тут сабраны роспісы паслоў розных краін. Ды не толькі паслоў.

Шмат разоў ездзілі ў басейн. Вельмі цікава і незвычайна — зроблены водныя горкі, а таксама штучныя хвалі. Як жа прыемна акунуцца ў цёплую ваду сярод зімы!

Прырода там зусім іншая. У іх зямля чырвонага колеру, глеістая. Раніцай устаеш — на двары мароз. Усё белае, але на вуліцы цвітуць кветкі.

З першага снежня нямецкія жыхары рыхтуюцца да сустрэчы Новага года. Вечарам горад ператвараецца ў казку. Загараюцца ліхтары, шыльды, усё зіхаціць неонавым святлом...

Л.Ч. Мяне ўразіла, як жывуць людзі. У кожным двары ёсць машына. Крамы поўныя прадуктаў, адзення, абутку. (Прадукты толькі надта дарагія). Калі немцы сядзяць за сталом, яны ядуць мала, у талерцы нічога не застаецца, магчыма таму, што яны не трымаюць гаспадаркі дома, адходы няма куды падзець. На вуліцы стаяць кантэйнеры — чатыры ці тры побач — каб смецце, якое выносяць, расфасоўвалі. Каробкі ў адзін кантэйнер, шкляныя слоікі ў другі, жалезкі ў трэці і г.д.

У Германіі мы пабывалі ў шматлікіх замках, хадзілі на каток, таксама былі ў музеі, дзе знаходзіцца вялізная калекцыя старажытных манет з розных краін.

Кожны дзень да 2 гадзін хадзілі пешшу. Спачатку было цяжка, а потым прывыклі і нават спадабалася. Толькі вось, калі мы ад'язджалі, нас ніхто не праводзіў. Не вельмі прыемна.

І.Н. Амаль у першы дзень адбылося невялікае здарэнне. Калі мы вярнуліся з экскурсіі, аказалася, што няма чатырох чалавек — заблудзіліся. Знайшлі іх хутка, а нямецкую выхавальніцу, якая вадзіла нас на экскурсіі, адразу звольнілі. Мы вельмі здзівіліся, бо ў нас такога не бывае. А ў Германіі, калі страціш работу, то атрымаць яе потым вельмі цяжка.

На выхадныя нас забіралі ў сем'і. Мы пазнаёміліся, а потым пасябравалі. Разам з сям'ёй наведалі Дрэздэнскую карцінную галерэю, потым музей фарфору. Там выстаўлены зробленыя для палаца фарфору скульптуры жывёл у натуральную велічыню, маленькія фігуркі для аздаблення святочнага стала, вялікая колькасць посуду і ваз. Больш за ўсё мне спадабаўся вялізны букет, зроблены з фарфору.

Усёй групай былі на катку, многія ўпершыню сталі на канькі, у тым ліку і я.

Яшчэ мяне вельмі ўразіла, што прыбіральшчыцы кожны дзень чысцілі карпусы, мылі шафы, вокны, ракавіны. Але за ўвесь час нам ні разу не мянялі пасцельную бялізну...

Калі я ў першы раз зайшла ў краму, то вочы адразу разбегліся і міжволі з'явіліся слёзы. Такога багацця і разнастайнасці тавараў я яшчэ ніколі не бачыла. Праўда, самі немцы, нягледзячы на вялікую колькасць тавараў у магазінах, апранаюцца абы-як. Каленкі ў спартыўных штанах абвісаюць, нават у царкву могуць так пайсці. А вось ужо ў оперны тэатр прыбраліся, як паўліны — усё дарагое, блішчыць, пераліваецца. Адразу відаць, што адправіліся на сустрэчу з нечым незвычайным, таямнічым, прыгожым.

С.К. Кіраўнікі нашай групы пастар Заўер і Барбара Коль аказаліся вельмі добрымі і вясёлымі людзьмі. За месяц мы так прывыклі да іх, што цяжка было развітвацца. За гэты час мы вельмі шмат чаго даведаліся пра гэту дзіўную краіну. Мы ездзілі на востраў Хергаланд, а мае гаспадары Юрген, Марыян і Ган-Катрын вазілі нас у Гамбург. Пазнаёміліся са шматлікімі равеснікамі, разам з імі хадзілі на дыскатэкі, на рок-канцэрт, разам праводзілі розныя святы. Упершыню я пачула, як гучыць арган. Гэта было, канешне, у царкве.

Нямецкім жанчынам дамашняя праца даецца лягчэй. Параўнайце самі: у іх суперпральная машына, якая выдае прадукцыю ўжо адпрасаванай; супермыечная машына для мыцця посуду, толькі на кнопкі націскай; электрасокавыціскалка, электрамясарубка, электракававарка, міксер і шмат чаго яшчэ. А розныя прыстасаванні для працы на прысядзібным участку! Ды што там! У маёй мамы дзве рукі — вось такі агрэгат, а нас у сям'і пяцёра. Паспрабуй управіцца! У нас шмат часу забірае прыгатаванне ежы, немцы ж карыстаюцца пераважна паўфабрыкатамі, якія толькі падаграюцца, пякуцца, смажацца. Слоў няма, нямецкія мужчыны любяць кухню. Яны самі мыюць посуд, пякуць пірагі, вараць каву, смажаць бутэрброды. І ўсё гэта з вялікім задавальненнем, бо лічаць, што жанчынам трэба дапамагчы, і ў апошніх застаецца шмат часу для заняткаў з дзецьмі ў сям'і. Немцы вельмі любяць пакаёвыя кветкі, іх цэлае мора ў кватэры.

Мяне, як настаўніцу, цікавілі перш за ўсё ўражанні аб школе, дзіцячым садку. Адна з дзяўчынак, напрыклад, некалькі разоў прыходзіла

ў дзіцячы сад па маленькага хлопчыка з сям'і, у якой жыла. Расказвала, што ў вялікім пакоі для ўмывання вісяць блакітныя ўціранкі, іх 90. Столькі там дзяцей. Яны падзелены на 3 вялікія групы, але не па ўзросту, а так, каб атрымалася па-сямейнаму, у кожнай групе дзеці ад трох да шасці год. У нас не раз і шмат пісалася пра рознаўзроставыя атрады, гэта лічылася дзёрзкім наватарствам і звязвалася з імем Макаранкі, але справа не пайшла, таму што ў нас праграмы, нават у дзіцячым садку, а як асвойваць праграму, калі дзеці рознага ўзросту?!

Агульных заняткаў у групе не бывае, усе дзеці гуляюць самі па сабе, і ў выхавальніц няма самай цяжкай працы: дзяцей не кормяць, не кладуць спаць. Іх прыводзяць зранку ў 7.30, а з 12.30 да 14.00 забіраюць дадому на абед, потым прыводзяць (дакладней, прывозяць) зноў. Лічыцца, што лепей абедаць дома, з татам і маці ці з кім-небудзь з родных, каб дзеці не адрываліся ад сям'і і не стамляліся ад дзіцячага садка. Як бачна, там дзіцячы садок — не жыццёвая неабходнасць, а выхаваўчы клопат.

Немцы лічаць, што дзеці павінны і сябраваць, і сварыцца — гэта нармальна; свабодна, па сваім выбары пераходзіць з адной кампаніі ў другую; лічаць таксама, што калі дзіця 10 хвілін сядзіць спакойна, значыцца, з ім штосьці не ў парадку, ці яно хворае — здаровае дзіця павінна шумець.

Другая дзяўчынка расказвала, што ў сям'і, дзе яна жыла, у трохгадовай "каралеўны" былі завушнічкі. Яна спытала, для чаго ж маленькай дзяўчынцы пракалолі вушкі — мама захацела? Тата-настаўнік усміхнуўся і адказаў, што не, мама якраз была супраць, але дзяўчынка настояла на сваім. Ёй дазваляецца настойваць на сваім! І ніхто не баіцца яе свавольства, ніхто не кажа:"Што з яе вырасце?"

Ну, а як жа школа?

Дзяўчаты смяюцца й кажуць:

— Дзесьці мы чыталі пра дзікае племя, якое замест усіх малітваў толькі і ўскліцала:"О!О!О!" Мы, канешне, стрымлівалі сваё "О!" у сабе, мы і выгляду не паказвалі, што ўражаны.

Зараз у Германіі шаснаццаць зямель, у кожнай зямлі свае школьныя міністры і школьныя правілы, поўная самастойнасць, але ў адным землі дагавараюцца паміж сабою: калі праводзіць канікулы. Таму што, калі адпусціць дзяцей па ўсёй Германіі ў адзін час, то на дарогах будуць грандыёзныя заторы, увесь рух у краіне спыніцца. Так і атрымліваецца, канікулы — па чарзе.

Сама школа — як школа, гэта не палац, і не тэатр, проста вельмі вялікі будынак. Школа сур'ёзная, а класы вясёлыя, у класах — фотаздымкі дзяцей, смешныя надпісы. Ні аднаго дзіцяці, ні аднаго настаўніка — усё зачынена. Ніякіх мерапрыемстваў — на канікулах настаўнікі, па нямецкіх паняццях, павінны адпачываць таксама, як і дзеці. У апошні дзень заняткаў напярэдадні канікулаў перад школай стаяць аўтамабілі-жытлішчы — з ложкам, халадзільнікам і печкай, каб разам са званком з апошняга ўрока накіравацца ў вандраванне. Немцы любяць падарожнічаць. Кажуць, дарэчы, немец нараджаецца з заплечнікам.

Мае дзяўчаты-выпускніцы і іх, канешне, цікавіла, якое будучае ў нямецкага студэнцтва.

Уявіце, што навучанне ва універсітэтах Германіі бясплатнае, але дорага каштуе жытло. У інтэрнат трапіць цяжка, і пакойчык ці кут у маленькім гарадку, перапоўненым студэнтамі, проста не знайсці. Усё дорага. Але вучацца! На лекцыі лепшых прафесараў збягаецца столькі студэнтаў, што прыходзіцца сядзець на падлозе. "У германскіх універсітэтах залішне багата жадаючых вучыцца", — уздыхаючы, сказала адна з будучых студэнтак.

Багата — гэта вось колькі: каля чвэрці ўсіх школьнікаў паступае ў гімназіі, палова з іх паступае ва універсітэты. Атрымліваецца, калі не памыляюся, удвая менш, чым у ЗША, але прыкладна ўдвая больш, чым у нас.

Для паступлення ва універсітэт экзаменаў здаваць не трэба, дастаткова даслаць заяву поштай — па пошце атрымаеш і пасведчанне аб прыняцці. Хто бяднейшы — дамагаецца стыпендыі ад дзяржавы; хто багацейшы — той, атрымаўшы пагадненне, едзе, шукае жыллё, запісваецца на курсы, якія яму цікавыя.

Аднак на спецыяльнасці, звязаныя з лабараторнымі заняткамі, дзе на падлозе не пасядзіш, трапіць значна цяжэй: тут конкурс атэстатаў.

У нас жа спрабавалі ўвесці школьны бал — атрымалася немаведама што. Адмянілі яго да здавальнення грамадскасці — перасталі вучыцца ў школах, расплодзілася рэпетытарства — бацькам прыходзіцца выкладваць шалёныя грошы, інакш не паступіць. Але ж калі меркаваць строга, то ўступныя экзамены — здзек са школы, выражэнне недаверу да настаўнікаў. Ва ўсім свеце школьны атэстат — важны дакумент, толькі ў нас — пустая паперка. Не будзем дыскуціраваць на гэту тэму, але відавочна, што менавіта ў гэтай кропцы і руйнуецца наша школа. Патрэбна, пэўна, прызнаць, што калі мы не ўмеем добра вучыць усіх і не хочам гэтаму майстэрству вучыцца, то лепей сумленна падзяліць школы так, як гэта робіцца ў іншых краінах, каб усё ж не рэпетытар пракладваў шлях ва універсітэт, а школьны настаўнік.

Наталля Чарнабай,
настаўніца,
наш няштатны
карэспандэнт.

НА ЗДЫМКАХ:
- **У аб'ектыве Германія.**

ТЫ ЧАКАЕШ ДЗІЦЯТКА...

Рэзка змянілася самаадчуванне. Перасыхае ў горле, здаецца, што мала паветра, хвалююць шматлікія пахі. Напрыклад, учора вельмі прыемна дыхалася водарам спелых суніц, а зараз жа на іх нельга глядзець. Або непераносным становіцца пах шампуню, якім ты так любіш мыць сваю галаву. Хочацца скарынку хлеба і чаго-небудзь незвычайнага — апельсінчыка там, лімончыка, заморскага арэха...

Што з табою, маё дзяўчо? Здаецца, у цябе пад сэрцам пасялілася штосьці невядомае, пяшчотнае? Ты адчуваеш, як набракаюць твае грудзі і па ўсім целе разліваецца істома асалоды? Няма сумнення — ты чакаеш дзіцятка...

Першае пачуццё ўзнёсласці прайшло. Зараз ты ў разгубленасці. Сэрцайка тваё стракоча.

Ты сказала свайму абранаму, што чакаеш маленькага, а ён насміхаецца і кажа, што гэта не даказана, чыё дзіця. Ты плачаш ад нечаканасці, ад разгубленасці. А ён цябе быццам не заўважае, ды яшчэ і сябрам расказвае, якая ты свавольніца, хочаш на яго зваліць лішнія клопаты.

Пачуццё страху пасяляецца ў тваёй душы. Што ж будзе далей? Супакойся, мая птушачка. Не плач, мая зорачка. Давай паспрабуем удзвюх разабрацца ў тым, што адбылося. Першае — здрада. І ў гэтай сітуацыі цьмянее твой ідэал, які, на маю думку, не заслугоўвае слова "мужчына". Не трэба за ім бегаць, прасіць аб нейкай міласці. Хіба ж няма ў цябе гонару? Ён быў у цябе адзіны, жаданы, непаўторны. Тваё сумленне чыстае перад ім і перад тым маленькім, які так добра адчувае сябе там, унутры, пад сэрцам. Зараз у яго закладваюцца зрок і слых, гены нясуць яму свой непаўторны характар... Табе хочацца шкляначку соку? Не адмаўляй сабе, паляжы хвілінку-другую. Занадта не хвалюйся. Хіба ты не выпестуеш яго адна. У цябе столькі волі, жадання...

Па-другое. Мама. Ты баішся сваёй мамы, маё сонейка. Табе страшна прызнацца ў сваёй бядзе, у сваёй радасці. Смялей. Памятай, што яна таксама нараджала цябе ў пакутах, і ўсё жыццё жадала табе толькі шчасця. Яна таксама жанчына, і ёй блізкія твае перажыванні. Выберы ціхі надвячорак, калі прыбраны посуд са стала, прыемным пахам разносіцца па хаце водар хрызантэм у вазе ля тэлевізара. Падыдзі да яе, уткніся ў плячо, паплач і скажы ўсё, як ёсць на самай справе. Запомні, што самая першая яе рэакцыя — здзіўленне, потым крык, слёзы — пройдзе, гэта ўсяго эмоцыі. Сэрцам яна з табой. Вы звязаны з ёй той пупавінаю, якую перарэзалі ў час родаў. Вы разам абдымецеся, пагаруеце, але ж і ўзрадуецеся. Як добра, што ў вашай сям'і будзе на аднаго чалавека больш. Ён яшчэ не нарадзіўся, але вы называеце пра сябе яго ўжо маленькім шпачком, які хутка будзе тупаць ножкамі па хаце і тузаць маладога дзядулю за бараду...

А калі няма мамы побач? Так, першая думка пра аборт. Канешне, яшчэ не позна. Але ж падумай, як ты сябе абкрадваеш гэтымі дрэннымі думкамі. У яго, немаўляці, ужо прарэзваюцца ручкі, носік, ножкі, ён вучыцца дыхаць, праўда, яшчэ ў вадзе. Хутка ён будзе нагадваць аб сабе пастукваннямі, калі яму не будзе падабацца ляжаць на бачку або падвярнуўшы ножку. І ўвесь час будзе расказваць табе вечную казку пра жаданне выйсці з цемры на свет. Разумееш, ён жывы там, у невядомай глыбіні жывата, у маленькай абалочцы вадкасці. Колькі адчаю будзе ў яго маленькіх вочках, калі ты адрачэшся ад яго, зробіш злачынства, якое наш Божухна лічыць самым бесчалавечным. Падумай, можа гэта другі Ламаносаў, славуты Эйнштэйн, таямнічы Леанарда да Вінчы, непаўторная Маргарэт Тэтчар або вядомы таленавіты хірург, чые рукі вяртаюць людзям жыццё? А можа гэта будзе звычайная дзяўчынка, падобная, як дзве кроплі вадзіцы, на цябе. Яна будзе таксама цудоўнай маці, як і ты. Мне не хочацца верыць, што ў наш трывожны век табе не патрэбна пяшчота, дабрыня. Не, мая кветачка. Не губі сваё здароўе. Набярыся мужнасці. Аборт — гэта ўжо ўсім вядома — хранічныя захворванні, немагчымасць мець дзяцей у далейшым, цяжкія роды і шмат чаго яшчэ.

Суседзі пабалбочуць і забудуцца. Яшчэ з падарункамі прыйдуць. Сяброўкі будуць зайздросціць і, уздыхаючы, казаць: "Ну якая ты малайчына. Не, мы ніколі не адважымся. Гэтыя роды, відаць, вельмі страшныя". Так, страшна. Але толькі да таго моманту, пакуль не праб'е час, і ў жывыя дзверы будзе грукаць новае жыццё. Здаецца, усё ў душы пераварочваецца, цела ломіцца наўпоперак ад балючых схватак. Ёсць кароткачасовыя перадышкі, калі можна адпачыць ад болю і падумаць аб тым, што хутка, вось-вось усё скончыцца, і ты сама станеш мамай. Мая зорачка, мая птушачка, крыху цярпення... Пасля родаў так цудоўна. Цела адпачывае, душа перапаўняецца радасцю і ляціць у нябёсы. Хочацца яшчэ раз прайсці праз усе мукі дзеля таго, каб прыгарнуць да сябе цёплы, дрыжачы камячок, з мокрымі яшчэ валаскамі на малюсенькай галоўцы, гладзіць і гладзіць такое кацянятка. А калі прыкладзеш гэтае немаўля да грудзей і бачыш, як яно шукае нешта гарачае і пульсуючае, здаецца, што моцы прыбывае не толькі яму, але і табе. Можна, пэўна, параўнаць кармячую маці з дрэвам, па якому вясною струменіцца гаючы сок, даючы жыццё новым парасткам і галінкам. Жыццё працягваецца — і ты не адна. Чалавек нарадзіўся! Пяюць птушкі, з веку ў век плешчацца мора, на зямлю льюцца лагодныя дажджы. Зычу шчасця табе на доўгія гады!

Н.Чарнабай.

ЗОРКА ПАЛЫН

Яна спынілася каля першай парты:

— Сідарэнка, калі я яшчэ раз пачую ад цябе гэтыя агідныя словы...

Сідарэнка ўсміхнуўся і лісліва (во акцёр!) зацягнуў:

— Ала Пятроўна, ды вы ж мяне ведаеце... Ды я... Ды ніколі . больш,— блазан нават перахрысціўся,— свечку за грэх у царкве запалю, вось пабачыце.

От, быццам бы яна і паверыла, але што ты з ім, гарэзай, зробіш?

Званок. Ала Пятроўна задаволена. Зараз урок прайшоў добра — хоць камісію пускай. Ад гэтага на душы было лёгка-лёгка. Выйшла ў калідор, завярнула за рог і слых ударыўся аб нечаканае:

— Наша мегера сёння як з ланцуга сарвалася. І чаго яна да мяне чапляецца? Старая дзеўка, уласных дзяцей не нарадзіла, а чужых выхоўвае. Пе-да-гог! — Сідарэнкаў голас змоўк, а потым нехта сплюнуў на падлогу. І расцёр абцасам.

Яна быццам прыліпла да сцяны калідора. І класны журнал задрыжэў у руцэ. Ад шыі ўверх, да твару, да самых каранёў валасоў падымалася чырвань. Хацелася закрычаць уголас, шпурнуць у кут акуляры, затупаць нагамі, разарваць таго Сідарэнку на маленькія кавалачкі. Яна закрыла вочы. Толькі б не заплакаць! Бо "пацячэ" туш, бо яна страціць аўтарытэт, бо ёй нельга, нельга...

Дзякуй Богу, гэта апошні ўрок. І яна апране свае шэрыя боты, накіне шэрую хустку, схавае вочы за каўняром і пабяжыць дадому. Апошнім часам яна хутка, амаль бегма, спяшалася дамоў. Школа побач — час трэба эканоміць. Хуценька шклянку гарбаты, кавалак булкі, і — за сшыткі. І так кожны вечар.

Сёння яна таксама пабегла, распранулася, наліла сабе шклянку гарбаты, а потым... потым раптам аднекуль з глыбіні, з самага нутра вырваўся стогн. Яна плакала. І нікога не саромелася. Бо гаспадыня кватэры паехала да дачкі, а гаспадар пайшоў некуды.

Злыдзень, што ён з ёй зрабіў? Бо яна кожны вечар угаворвала сябе, што — шчаслівая, што яе паважаюць калегі і любяць дзеці, што мае цікавую працу, што ёй болей нічога не патрэбна для шчасця... Не ўгаварыла, не. Бо нейкі голас унутры здзекліва смяяўся: "Шчаслівая? Што ж падушка твая мокрая кожную ноч? Што ж ты заснуць не можаш да ранку?"

Некалі смяшлівая, з гумарам і густам, лепшая дзеўка на раёне, першая ў інстытуце. Стыпендыятка, душа кампаніі, зубрыла і весялуха. Кожны вечар — танцы, кавалеры, вучоба давалася лёгка — аж смешна. Па размеркаванню ішла чацвёртая, дзіва што, чырвоны дыплом! А потым — планы, дзённікі, неслух Сідарэнка, праверка з райана, дыскусія аб Аманашвілі... цікавае жыццё! Яно бегла жвавай такой крынічкай, бегла, бегла, а потым... Адна. Заўсёды адна. З сшыткамі, з часопісамі, з планамі, але — адна. А, між іншым, ужо трыццаць восем. Побач — НІКОГА! І тут на чацвёртым дзесятку яна, дурніца, зразумела, што аддала б усе свае ганаровыя званні за лёгкі дотык мужчынскай рукі...

Яе ніхто сёння не чуе. Не бачыць. І не трэба гуляць у схованкі. Можна выць, бы ваўчыца ў зімовую ноч, можна прысланіцца гарачай шчакой да акенца, можна ўсё. Нельга толькі нічога змяніць. Бо яна ўжо не мае моцы зрабіць свой твар усмешлівым і прывабным, бо не хапае сіл ні на макіяж, ні на какецтва, бо няма часу на спатканні-пацалункі. А мужык жа патрабуе ўвагі, кахання і яшчэ шмат чаго. А яна... яна нічога ўжо не здолее зрабіць.

І таму яе чакае халодны ложак. Халодны, бы магіла. Назаўсёды?

У дзверы зазірнула гаспадыня (І калі яна прыехала?).

— А я ўжо тут, Алачка. Як справы?

(Вельмі дрэнна. Так дрэнна, што крываточыць сэрца).

— Нішто сабе, Ганна Уладзіміраўна. Усё як мае быць.

— От шчаслівая ты! Сёння пра цябе артыкул у мясцовай газеце чытала. Лепшы настаўнік раёна! Гонар які! Ты ж той артыкул схавай, потым унукам паказваць будзеш...

Божачкі, хай бы хто зазірнуў у яе душу, ён пабачыў бы, якая там цемра і горыч! А Панамарова з 8-Б сёння спытала:

— Ала Пятроўна, як вы ставіцеся да сексу?

А ніяк не ставіцца. Бо не ведае, што гэта такое наогул. І, мабыць, толькі чорная зайздрасць да Панамаровай, якая ўсё-ўсё ведае, штурхнула яе на жорсткі адказ:

— Немаўля ты яшчэ. Се-е-кс яе цікавіць. Хай табе часопісы адказваюць, а не я.

Не, трэба шчыра прызнаць — яна прайграла жыццё. Выцекла яе шчасце між пальцаў. Няўжо ўжо позна? Але бывае, і ў пяцьдзесят... дурніца, што ж ты не разумееш, гэта Джэйн Фонда можа ў пяцьдзесят замуж выходзіць, а не нашы жанчыны...

Можа, у "Клуб, каму за 30" схадзіць? Аб'яву напісаць? Што рабіць, Госпадзі?

А пакуль што трэба сшыткі праверыць. План напісаць. А калі працуеш, тады на нейкі час некуды знікае глухі сардэчны боль. Але ж гэта толькі на час... На начным небе ўсходзіла зорка Палын.

Ніна Пракопчык.

Прыехалі, або Пра тое, аб чым і не здагадваюцца мафіёзі.

ША!

Спачатку спрэчка дзвюх жанчын аб кошце беласнежнай блузкі нічым не адрознівалася ад звычайнай базарнай размовы сяброўак, якія выпадкова сустрэліся на Камароўцы. Хутка атмасфера напалілася, і абодва бакі, якія поўнасцю правялі ўсе свае галасавыя здольнасці, усё ж сышліся на адзінай лічбе.

У працэсе пошуку камерцыйнага кансенсуса ніхто не заўважыў з'яўлення хударлявага бландзіна ў пацёртай куртцы-варонцы, які злёгку "пацёрся" каля ачага куплі-продажу, а затым паціху адышоў.

...Жанчына ахнула, калі раскрыла сумачку – тонкі парэз бакавой часткі сведчыў аб прафесіянальнай заточцы брытвы. На вачах з'явіліся слёзы.

Але не паспела пацярпеўшая расплакацца на ўсю моц, як непадалёк на рукавах "варонкі" шчоўкнулі наручнікі. На радасць "без пяці мінут абчышчанай", чацвёра нічым не прыкметных знешне хлопцаў скруцілі злодзея, з кішэні якога выпаў кашалёк...

Хто ж выратавальнікі? Супрацоўнікі аператыўна-пошукавага аддзела. Галоўная задача гэтага зусім новага структурнага падраздзялення міліцыі – барацьба з маёмаснымі злачынствамі з дапамогай нетрадыцыйных метадаў.

У складзе аддзела ў асноўным моладзь, якую, паводле слоў яго начальніка – палкоўніка міліцыі У.Ільянкова (старога і вопытнага сышчыка), трэба яшчэ многаму вучыць. Але ўклад аддзела ў агульную скарбонку выяўленых, раскрытых і прадухіленых злачынстваў даволі значны.

У мінулым годзе супрацоўнікі АПА УУС Мінгарвыканкама раскрылі 580 злачынстваў толькі па лініі крымінальнага вышуку. У сферы эканомікі выяўлены 162 злачынствы. А яшчэ супрацоўнікі АПА выявілі і затрымалі 11 груп вымагальнікаў.

Што ж за нетрадыцыйныя метады ў іх? Вядома, ні адзін аператыўнік не падзеліцца прафесійнымі тайнамі. Каб хоць як-небудзь задаволіць цікаўнасць чытачоў (не рызыкуючы разгнявіць вышукнікоў), прыадкрыю заслону.

Эфектыўнасць і дзейснасць вышуку залежаць перш за ўсё ад майстэрства і вопыту. Гранічная сабранасць і неардынарнасць мыслення забяспечваюць поспех на 99 працэнтаў. "Сфатаграфаваць" набліжэнне кішэнніка да ахвяры і траекторыю ляза або брытвы – гэта яшчэ не ўсё.

Неабходна бачыць усе дэталі злачынства, каб пасля затрымання прад'явіць бясспрэчныя доказы. Бо зараз злодзеі хітры як ніколі. І своечасова "скінуць" апустошаныя кашалькі ён умее.

Метад асабістага вышуку дае магчымасць выканаць многія задачы. Гэта і пошук злачынцаў, і "абмацванне" нітак, якія звязваюць злачынныя групы, і многае іншае.

Дзень сённяшні – час чэргаў, а гэта выдатная прынада для злодзея. Сумбур і скандалы ў іх – для яго добрыя памочнікі. Ён не цікавіцца ўсім тым, што знаходзіцца на прылаўках, уся яго ўвага на сумках і пакетах тых, хто цярпліва чакае."Вылічае" ахвяру, робіць ход... А далей ход у адказ вышукнікоў.

Зусім нядаўна былі затрыманы злачынцы, якія рабавалі кватэры. Падрабязнасці пакуль прапусцім – ідзе следства. Скажу толькі, што "павязалі" іх пры збыце крадзенага, прычым злачынства было раскрыта яшчэ да паступлення ў міліцыю заяў пацярпеўшых. Такое бывае даволі рэдка, і ў міліцэйскім асяроддзі лічыцца сведчаннем высокага прафесіяналізму.

– Ды не маё гэта, начальнік! – спрабаваў пераканаць вышукнікоў малады хлопец, знерваваны паказваючы ў бок скрутка з дэфіцытнымі таварамі.

– Віця, не трэба гэтых фокусаў,– спакойна адказаў "опер" і тут жа "на пальцах" даказаў віну злодзея. Той засумаваў.

Так, гэтых самых "фокусаў" хапае. За кожным з іх – процьма сіл, поту, а то і крыві супрацоўнікаў міліцыі. І галоўнае не тое, што скажа юны "мафіёзі" – па яго справе ўсё зразумела. Проста міліцыянер, які ў бацькі падыходзіць хлопцу, спрабуе па-добраму пераканаць яго, што не тым шляхам пайшоў. Жыццё ж для яго толькі пачынаецца.

Сярод шматлікай пошты, што паступае на імя начальніка УУС Мінгарвыканкама, ёсць розныя лісты. Вось радкі аднаго з іх:

"Шаноўны таварыш Піліпенка, піша вам работніца Мінскага гадзіннікавага завода. Шчырае дзякуй вам за працу вашых супрацоўнікаў, якія вярнулі мне выкрадзеныя ў ГУМе грошы..."

І лістоў такіх нямала.

С.Рачыла,
супрацоўнік УУС Мінгарвыканкама.

ІНФА-КРЫМ

Добрай ночы

можна нарэшце пажадаць жыхарам Фрунзенскага раёна г.Мінска. Супрацоўнікі гарадскога крымінальнага вышуку выявілі і затрымалі групу падлеткаў, якія на працягу студзеня-лютага гэтага года абрабавалі тут шэраг кватэр. Частка выкрадзенага канфіскавана, вядзецца следства.

"Трэцяя змена"

У той час, як некаторыя беларускія заводы, у прыватнасці "Гомсельмаш", спыняюцца, на шэрагу мінскіх прадпрыемстваў праца кіпіць літаральна ноччу і днём. Напрыклад, трое рабочых Мінскага аўтазавода, адпрацаваўшы дзённую змену, ноччу спрабавалі выкрасці з тэрыторыі 15 колаў для "МАЗа". А на кандытарскай фабрыцы "Камунарка" міліцыянеры Ленінскага РАУС затрымалі двух злодзеяў, якія выкралі з аднаго з цэхаў 20 кілаграмаў сметанковага масла.

"Абрабаванне стагоддзя"

Якія часы, такія і злачынствы. Так можна перафразаваць словы класіка, пераклаўшы іх на нашу рэчаіснасць. А злачынствы цяпер бываюць самыя розныя. Днямі супрацоўнікі Цэнтральнага РАУС сталіцы затрымалі двух рабаўнікоў: 40-гадовага Д. і 20-гадовую Ч., раней неаднаразова судзімых, у цяперашні час бомжаў. Ноччу яны абрабавалі прахожую бабульку... на 4 рублі.

Жудасны "падснежнік"

знайшлі мясцовыя жыхары днём 16 лютага непадалёк ад шашы "Масква—Брэст" у раёне вёскі Рудня: з-пад талага снегу выглядаў напалову разложаны труп мужчыны. Хутка было ўстаноўлена, што гэта Б., жыхар адной з суседніх вёсак, які ў кастрычніку мінулага года прапаў без вестак. Паводле заключэння экспертызы, смерць настала ў выніку наезду легкавой аўтамашыны.

Прывітанне ад мафіі

атрымаў адзін з супрацоўнікаў Кастрычніцкага РАУС Мінска. У ноч на 17 лютага ў вайсковым гарадку Мачулішчы ўгналі яго машыну "Жыгулі".

Хапіла ж сіл!

На мінулым тыдні быў абрабаваны дачны дом у вёсцы Пціч Мінскага раёна, які належыць жыхарцы Мінска. Выкрадзены тэлевізар, дыван, 20 літраў яблычнага віна, шматлікія варэнні і саленні, паўтара цэнтнера бульбы, 50 кілаграмаў сала і 40 — мяса. Застаецца толькі здзіўляцца нахабству і сіле рабаўніка, які здолеў усё гэта выкрасці.

Дзякуй інфляцыі

У ноч на 16 лютага невядомы пранік у дом жыхаркі вёскі Вяліцічы Барысаўскага раёна, адкуль выкраў некалькі ювелірных вырабаў, 3000 рублёў, 1500 купонаў, а таксама ашчадныя кніжкі на 26 тысяч. Суцяшае адно: калі раней злодзей мог бы набыць на гэтыя грошы як мінімум дзве аўтамашыны, то цяпер яму іх надоўга не хопіць.

"Арляняты" навучацца лятаць...

У мінулыя выхадныя была ўчынена спроба "падрэзаць крылы" беларускім "арлянятам": два нядобрыя дзядзькі выкралі 8 лыжкаў з аднаго з карпусоў піянерскага лагера "Арляня", аднак былі затрыманыя. Такім чынам, ёсць падставы лічыць, што "арляняты" ўсё ж навучацца лятаць (працяг вы ведаеце).

У бюро дзяжурыў П.Сіманаў.

ЗАБЫТАЯ СЛАВА

Кароткі агляд ваеннай гісторыі Беларусі

(Працяг. Пачатак у № 7)

Летам 1236 г. войскі Ордэна мечаносцаў былі разгромлены каля Шаўляя аб'яднаным беларуска-літоўскім войскам. Гэта прымусіла мечаносцаў пайсці на аб'яднанне з Тэўтонскім Ордэнам і ўтварыць сумесны Лівонскі Ордэн са сталіцай у Рызе. Рыцары і надалей працягвалі свой агрэсіўны курс у дачыненні да народаў Прыбалтыкі, Беларусі, зямель Пскоўшчыны і Наўгародчыны. За перыяд з 1230 па 1284 г. тэўтонцы падпарадкавалі Прусію і зрабілі яе базай для сваіх паходаў на суседнія тэрыторыі. У процістаянні ім гартавалася баявая вывучка беларускіх палкоў. Асабліва праявілі сябе палачане і віцябчане ў бітвах ля воз.Дурбэ (1260 г.) і Ленавардэнам (1261 г.).

Узброеныя сілы Лівонскага Ордэна дзейнічалі не толькі ў беларускім Падзвінні. З 1250 г. яны пачалі рабіць набегі ў глыб Панямоння. Так, у 1250 г. магістр Лівонскага Ордэна Андрэй фон Шцірлянд напаў на Наваградак, але захапіць яго не здолеў. У 1284 г. зрабілі свой першы паход на Гародню крыжакі з Прусіі. Сюды яны яшчэ будуць прыходзіць каля 20 разоў. Пачынаючы з сярэдзіны XIII ст. і па 1345 г. крыжакі зрабілі 30 паходаў, Прускі Ордэн зрабіў 70 паходаў, а Лівонскі — 30 паходаў. У часы праўлення Кейстута (1345—1382 гг.) саюзнае беларуска-літоўскае войска адказала 30 паходамі на Прусію, 10 паходамі на Лівонію. За адносна кароткі перыяд у 37 гадоў было зроблена з абодвух бакоў 140 паходаў. Прычым, за апошнія 12 гадоў праўлення Кейстута (1370—1382 гг.) адбылося 75 паходаў. У сярэднім па 6 паходаў у год. Больш як 15 паходаў было зроблена крыжаносцамі ў часы праўлення Вітаўта (1352—1430 гг.). Апошні драпежніцкі паход крыжакі з Лівоніі ажыццявілі ў 1413 г.

Землі Беларусі і Літвы шчодра паліты крывёю іхніх лепшых сыноў, якія зрабілі непамерна вялікі ўклад у агульнаеўрапейскую вызваленчую барацьбу эпохі Сярэднявечча. Дарога да перамогі густа выслана целамі многіх тысяч бясстрашных і слаўных віцязяў. Аб муры многіх беларускіх замкаў пашчарбілі свае мячы драпежныя чужынцы. Акрамя Гародні, яны 4 разы беспаспяхова — у 1250, 1314, 1391 і 1394 гг. — штурмавалі Наваградак. Пяць разоў — у 1333, 1334, 1366, 1382 і 1386 гг. — бачыў іх горды і нескараны бацька гарадоў беларускіх слаўны горад Полацак. Тройчы — у 1384, 1392, 1394 гг. — яны спрабавалі ўзабрацца на высокія муры Лідскага замка. Акрамя сцягоў нямецкіх рыцараў, тут развяваліся харугвы рыцараў Англіі, Францыі, многіх іншых краін Еўропы. Бачылі іх пад сваімі сценамі Крэва, Бярэсце, Камянец, Ваўкавыск, Мядзел, Дзісна, Браслаў, Свір і незлічоныя вёскі — па іх не раз прайшлася разбуральная вайна. Аднак найбольшую славу непрыступнай цвярдыні, пра якую ведала ўсё еўрапейскае рыцарства, атрымала старажытная Гародня, ці "замак Гартэн", як яго называлі прускія храністы. Пачынаючы з 1284 і па 1402 г., крыжакі зрабілі на гэтае арлінае гняздо Панямоння каля 20 паходаў. Бадай, не знайсці краіны ў Еўропе, рыцары адкуль ні пабывалі б пад сценамі "недаступнага Гартэна". Паход "на Гартэн" лічыўся вышэйшай адзнакаю і гонарам маладога еўрапейскага дваранства, рамантычнай тэмаю прыдворных свецкіх баляў і піроў. З Германіі, Францыі, Швецыі, Галандыі, Даніі, Італіі, Іспаніі, Чэхіі і Англіі — атрад за атрадам ішлі крыжакі "на Гартэн". Хто іх толькі ні ўзначальваў: магістр тэўтонаў Конрад Цірнберг (1284 г.), комтуры Кёнігсберга і Брандэнбурга, магістры Лівонскага Ордэна і англійскія графы Чэмберлены, Нортумбеленгі і Бэдфарды. Больш як чвэрць стагоддзя абаронай Гародні кіраваў непераможны князь Давыд Гарадзенскі, які са сваёй дружынай хадзіў на выручку Навагрудку і Пскову, рабіў "кінжальныя" рэйды ў Прусію, пад Брандэнбург і Франкфурт-на-Одэры. Не маючы сіл адолець Давыда ў адкрытым баі, немцы з дапамогай наёмнага забойцы, польскага рыцара Андрэя Госта, па-здрадніцку забілі яго ў 1328 г.

Сумеснае беларуска-літоўскае войска выйграла буйнейшую бітву еўрапейскага маштабу на рацэ Стрэве ў Латвіі. Немцам на падмацаванне прыбылі рыцары з Францыі і Англіі. Усяго іхняе пешае і коннае войска, на чале з магістрам, налічвала каля 40 тысяч чалавек. Беларуска-літоўскія дружыны былі ўзмоцнены харугвамі з Полацка, Віцебска, Гародні, Навагрудка, Бярэсця, Смаленска, Уладзіміра-Валынскага. Саюзнае войска не саступала рыцарскаму ні па колькасці, ні па ўзбраенню. Па маштабу і па свайму стратэгічнаму значэнню бітва на р.Стрэве можа раўняцца вядомаму пабоішчу на Куліковым полі. Яна прынесла заслужаную перамогу і славу князям Альгерду і Кейстуту.

Паколькі дзевяць дзесятых насельніцтва дзяржавы складалі не літоўцы, то зразумела, што асноўны цяжар паходаў і бітваў падаў на плечы гараджан Беларусі і ў меншай ступені Украіны. Аснову войска складалі служылыя баяры, гарадскія апалчэнні, простыя "воі"-сяляне, слугі і нават адпушчаныя на волю рабы-паланянікі. Развітая дзесяцічна-соценная структура іх арганізацыі, адшліфаваная ў папярэднія стагоддзі, эканамічны патэнцыял гарадоў, высокі тэхнічны ўзровень зброі рабілі гэта войска надзейным гарантам у процістаянні крыжацкай агрэсіі.

Прускія храністы сведчаць, што пастаянная барацьба і гатоўнасць да абароны вымагалі ад вялікіх князёў максімальных высілкаў пры арганізацыі адпору рыцарскім драпежным паходам. Вітаўт нават пастанавіў, што кожны баярын быў абавязаны з'яўляцца на службу толькі конна. Калі ж нехта каня не меў, то мусіў прадаць у рабства жонку і дзяцей, але з'явіцца на вайну конна.

Рашаючая бітва сіл народаў Усходняй Еўропы (Польшчы, Беларусі, Літвы, Украіны, некаторых рускіх зямель, Чэхіі, Валахіі і інш.) адбылася 15 ліпеня 1410 г. каля в. Грунвальд у Альштынскім ваяводстве. Войскі ўзначальвалі польскі кароль Ягайла і вялікі князь літоўскі Вітаўт. Пад іх началам было 90 харугваў. Гэтыя воінскія фарміраванні былі рознымі па колькасці людзей, але ў сярэднім гэта складала 1000 чалавек. Звычайна тут мелася 200 коннікаў і 800 пехацінцаў. Палова іх была пры сцягу і абараняла яго. Дакладных звестак аб колькасці процістаячых войскаў няма. Па адных звестках пад началам Ягайлы і Вітаўта было каля 100 тыс. чалавек (уключаючы 30 тыс. татар хана Джэлаладдзіна, сына Тахтамыша Сарайскай Арды), па іншых крыніцах усяго 32 тыс. Прыблізна таксама ацэньвалася войска крыжакоў. З 90 харугваў 43 былі беларуска-ўкраінскія. Хронікі зафіксавалі тут харугвы Полацкую, Віцебскую, Гарадзенскую, Берасцейскую, Пінскую, Наваградскую, Лідскую, Ваўкавыскую, Драгічынскую, Лельніцкую. Польскі храніст Ян Длугаш называе яшчэ тры харугвы Смаленскай зямлі, але аналіз фактаў, дакументаў і розных крыніц паказвае, што са Смаленска, як і з усіх гарадоў, была толькі адна харугва. Астатнімі былі Мсціслаўская і Аршанская, якія стаялі разам са смаленцамі. Прыйшлі яшчэ Заслаўска-менская, Слуцкая і Магілёўская, Крэўская, Кабрынская, Лукомская харугвы. Былі атрады чэхаў, мараваў, сілезцаў, валахаў. Стаялі ў ратным страі пасланцы Ноўгарада Вялікага, Ноўгарада-Северскага, Старадуба і іншых мясцін. З 40 харугваў Вітаўта 30 мелі на сваіх сцягах "Пагоню", а на 10 — герб "Калоны".

Бітва распачалася з артылерыйскай дуэлі. Першыя атакі супраць левага крыла крыжакоў пачала лёгкая конніца ВКЛ, на якую абрушыліся самыя моцныя ўдары праціўніка. Пасля жорсткіх і крывапралітных сутычак цяжкая конніца рыцараў пацясніла кавалерыю Вітаўта і частку першых харугваў. Астатнія яго харугвы вялі зацяты бой на левым флангу, дзе асабліва вызначыліся тры палкі пад камандаю мсціслаўскага князя Сямёна-Лінгвена — гэта смаленскі, аршанскі і мсціслаўскі. Адзін з гэтых палкоў загінуў цалкам, астатнія выстаялі і злучыліся з польскімі харугвамі. Адзіным магутным ударам саюзнікі прарвалі фронт, акружылі ворага і к вечару закончылі разгром крыжакоў. Ордэн страціў больш за 30 тысяч забітымі, паранемымі і палоннымі. Былі забіты вялікі магістр Ульрых фон Юнінген і многія знатныя рыцары.

Разгром крыжакоў пад Грунвальдам спыніў агрэсію Тэўтонскага Ордэна на ўсход, садзейнічаў эканамічнаму развіццю Беларусі і суседніх земляў, іхняму ўсталяванню ў агульнаеўрапейскім доме.

IV

Калі ў XIV—пачатку XV стагоддзя асноўную пагрозу для беларуска-літоўскага гаспадарства ўяўляла крыжацкая небяспека, дык пазней пачало хутка ўзрастаць значэнне ўзаемадачыненняў з усходнім суседам — Маскоўскаю дзяржавай, якая згуртоўвала землі вакол сябе. Вільня і Масква рабіліся зацятымі супернікамі.

У сярэдзіне XIV ст. канфлікт разгарэўся з-за ўплыву на Смаленскае княства. Смаленшчына — частка былых крывіцкіх зямель была генетычна і гістарычна звязана з беларускаю дзяржаўнасцю. Звязваў Смаленск з Вялікім княствам і гандаль з Рыгаю. Аднак гэтае княства пакутавала ад нападаў маскоўцаў. Калі ў сярэдзіне XIV ст. у Смаленску часова перамагла прамаскоўская партыя, гэта сапсавала адносіны паміж двума суседзямі і родзічамі. У канцы 60-х гадоў пазіцыі Вялікага княства Літоўскага на Смаленшчыне ўзмацніліся: у 1367 г. Андрэй Альгердавіч Полацкі заняў Родню і Хорвач — два гарадкі на поўдзень ад Смаленска. У рэшце рэшт смаленскі князь Святаслаў Іванавіч стаў верным саюзнікам Вялікага княства й разам з вялікім князем Альгердам у 1368, 1370 і 1372 гг. змагаўся супраць маскоўскіх войскаў, якія імкнуліся перашкодзіць аб'яднанню беларускіх зямель. Смаленскія палкі хадзілі і на крыжакоў.

Дадаткова абвастрыліся адносіны паміж Вялікімі княствамі Маскоўскім і Літоўскім у сувязі з антымаскоўскімі тэндэнцыямі ў палітыцы Цвярскога княства, якое знайшло сабе саюзнікам беларуска-літоўскую дзяржаву. З гэтым і звязаны знакаміты паход 1375 г. на Маскву. Беларускія хронікі досыць красамоўна адлюстроўваюць тыя падзеі. На світанку вялікі князь Альгерд разам са сваім войскам узышоў на Паклонную гару. Маскоўскі князь Дзмітрый (будучы Данскі), рэальна ацаніўшы сілы й бачачы бесперспектыўнасць бітвы, першым прапанаваў замірэнне."А пасля доўгіх намоваў даўся Альгерд да яднання й міру, але пад умоваю, каб яму вольна было з часткаю рыцарства й панамі вернымі да замку Маскоўскага збройнымі ўехаць". У крамлёўскім саборы Альгерд заявіў:"Бачыш, княжа Дзмітрый, хто з нас раней на вайну ўстаў". Гэтыя падзеі й словы даюць магчымасць адзначыць мабілізацыйныя здольнасці беларуска-літоўскай дзяржавы й тактычную мабільнасць яе войска, што ў дадзеным выпадку з'явілася перадумовай перамогі. Падзеі адбываліся на Вялікдзень й Альгерд падараваў Дзмітрыю чырвонае каляднае яйка, а затым зламаў сваю дзіду аб браму Масквы, каб Масква памятала, што беларуска-літоўскае войска было тут і "дзіду сваю Альгерд крушыў аб браму".

У выніку мірных перамоваў канфлікт быў заладжаны. Праўда, толькі часова.

Новы крызіс у адносінах беларуска-літоўскай дзяржавы й Вялікага княства Маскоўскага ўзнік ужо за часамі Вітаўта Вялікага. І гэтым разам асаблівая ўвага Масквы была звернута да Смаленска. Таму вялікі князь Вітаўт мусіў у 1405 г. падысці пад сцены Смаленска з вялікім войскам і артылерыяй. Здраднік князь Юры Святаслававіч Смаленскі ўвайшоў у змову з Масквою й накіраваў паслоў да крыжакоў па дапамогу. У адсутнасці князя Вітаўт з удзелам смалян ўвайшоў у горад.

Але толькі пасля Дуброўны (Грунвальда) і ліквідацыі крыжацкай пагрозы беларуска-літоўскі гаспадар здолеў па-сапраўднаму супакоіць Маскву. Падставаю для вайсковага паходу было абрабаванне ў 1416 г. пад Пуціўлем маскоўцамі беларускіх купцоў. Вітаўт Вялікі досыць хутка арганізаваў вайсковую экспедыцыю. Два войскі сустрэліся на р. Вугры. Патрабаванні беларуска-літоўскага гаспадара былі наступнымі: пакаранне рабаўнікоў і кампенсацыя маскоўскім бокам вайсковых выдаткаў. Пад час перамоваў адзін з беларускіх рыцараў Андрэй, не вытрымаўшы, ускрыкнуў:"Не мірыся, Вітаўце, не мірыся, таму што на самай справе мы з Масквою яшчэ не біліся!" Маскоўцы выканалі ўсе патрабаванні Вялікага князя Літоўскага.

У выніку вайсковых і дыпламатычных дзеянняў беларуска-літоўская дзяржава пашырыла межы на ўсход. Ягоная мяжа праходзіла ажно каля сучаснага Мажайска — за 107 вёрстаў ад Масквы.

Ужо пры вялікім князю Казіміру, у 1458 г., адбылася наступная вайна. Маскоўскі князь Васіль сабраў вялікае войска, заклікаўшы на дапамогу казанскага хана, і падышоў да Вязьмы, якая тады належала Вялікаму княству Літоўскаму. Па шляху маскоўцы "руйнавалі й палілі воласці". Па Беларусі й Літве князь Казімір таксама склікаў войска, наняўшы дадаткова польскіх жаўнераў. Гетманам быў пастаўлены беларускі магнат Станіслаў Кішка. Вялікі князь Казімір застаўся ў Смаленску, а гетман рушыў з войскам насустрач маскоўцам. Але вораг ужо паспеў вывесці свае аддзелы з тэрыторыі беларуска-літоўскай дзяржавы. Па слядах праціўня гетман Кішка ўварваўся ў маскоўскія воласці, узяў крэпасці Мажайск, Казельск, Веру, Калугу. Калі Масква падцягнула 15-тысячнае войска, гетман Кішка хутка адрэагаваў на з'яўленне такой значнай сілы. У сваім тыле беларускі гетман "у хітрых засадах" пакінуў аддзелы Зіновіча й двух Радзівілаў, а сам выступіў насустрач ворагу."Масква.., у вялікасці войска свайго, вельмі ахвотна... ударыла" па беларускіх аддзелах Кішкі. Гетман у сваю чаргу пачаў адводзіць хутка сваё войска й прывёў Маскву на Зіновічавы й Радзівілавы роты, наўмысна пастаўленыя ў засадзе, а потым сам Кішка абярнуўся, а Зіновіч і Радзівілы ўдарылі па ворагу з бакоў. Дзве мілі гнала беларуска-літоўскае войска маскоўцаў "секучы, рубячы, колючы". Гэта паведамленне "Кронікі Літоўскай і Жамойскай" асабліва каштоўнае тым, што знаёміць нас з тактыкай бою беларускіх ваяроў супраць перавышаючага праціўніка.

(Працяг будзе).

Ваяры Вялікага княства Літоўскага XIV—XV ст. ст.

24, панядзелак

Беларускае тэлебачанне

16.30. Навіны.
16.35. Беларуская мова. 1-ы
16.50. Дзень добры ў хату! Эстэтычнае выхаванне ў СШ № 108 г.Мінска.
17.35. "Чэснае слова", "Мама для маманцяняці", "Казка пра старое Рэха". Мультфільмы.
18.00. "Жостаўскі роспіс". Кінанарыс.
18.10. "Пра Чарнобыль ведаюць усе". Аб рабоце міжнароднай гуманітарнай пазаўрадавай арганізацыі "Чарнобыль – дапамога".
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Брэст).
19.35. Наш каментарый. "Баба сеяла гарох".
19.50. Гаспадар. Саўгас "Дабраахвотнік" Клічаўскага раёна.
20.25. Калыханка.
20.45. Ліра. Частка 1-я.
21.50. Спартыўны тэлекур'ер.
22.10. Ліра. Частка 2-я.
23.05. НІКа.
23.20. Спявае М.Мусабаеў (Казахстан).

I канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. Мультфільмы.
8.20. Дак.фільм "След".
8.45. "Што такое цырк?".
9.25. Мастацкі фільм "Час землямераў", 1-я серыя.
10.30. Дак.фільм "Ён любіў Гір'я".
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.20. Гэта было, было...
14.40. "Дзіўныя дарослыя". Мастацкі фільм.
16.00. "Залатая антылопа". Мультфільм.
16.30. "Век асветы". Навукова-папулярны фільм.
17.00. Навіны.
17.20. Пад знакам "пі".
17.50. "Сунічны дождж". Мультфільм.
18.00. Рэформа: тыдзень за тыднем.
18.40. Мастацкі фільм "Час землямераў". 1-я серыя.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. "Новая студыя" прадстаўляе...
20.55. Аўтарскае тэлебачанне. "ТБ-галерэя", "Аднак", "Рэха".
22.00. "Новая студыя" прадстаўляе... У перапынку (23.00) – Навіны.
24.00. "Гамлет". Фільм-балет.

Канал "Расія"

17.00. "Навошта Голышаву мільёны".
17.30. Вольны час. "Дамашні клуб".
17.45. Тварам да Расіі.
18.00. "Расійскі бізнесмен-91". Фінал.
19.00. Вестprograms.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. "Расійскі бізнесмен-91" (працяг).
20.55. Пятае кола.
22.00. Вестkі.
22.20. Пятае кола. Працяг.
23.05. Прысвячэнне Міхаілу Фокіну.

25, аўторак

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. "Карнавал у Венецыі". Кінанарыс.
9.00. Беларуская мова. 1-ы клас.
9.15. "Сёння і штодзень". Тэл.фільм.
10.15. Процістаянне. Маральна-прававая праграма.
11.15. "Ад і да". Тэлетаргі.
11.30. "На ўсё астатняе жыццё". Мастацкі фільм. 1-я серыя.
16.30. Навіны.
16.35. Гісторыя Беларусі. 9-ы клас.
17.10. Творы Ф.Шапэна ў выкананні выхаванца музычнага ліцэя пры Белдзяржкансерваторыі Ю.Сяргея і Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра Беларусі.
17.50. "Лёгкі хлеб". Мультфільм.
18.00. "Дзень добры, Фенікс". Дак.фільм.
18.20. "Пакуль любоў жыве, і ты жывеш...". Паэзія Нізамі Гянджаві.
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Віцебск).
19.35. Наш каментарый. "Тры рацыёны".
19.40. Эканамічная хваля. "Што маем – не цэнім...". Аб адносінах да прыродных рэсурсаў. Прамая лінія. У перапынку (20.25) – Калыханка.
21.00. Тэлебіржа.
21.20. "Канец вечнасці". Мастацкі фільм.
23.30. НІКа.

I канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. Канцэрт з твораў М.Будашкіна.
8.20. "Радзіме пакланіцеся...". Аб тургенеўскіх мясцінах Расіі.
9.25. "Час землямераў". 2-я серыя.
10.30. Дак.фільм "Анёл затрубіў...".
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Дак.фільм "Хаматэк" на шляху да рынку".
11.50. С.Танееў. Сімфонія № 2 сі-бемоль мажор.
12.25. Рытмічная гімнастыка.
12.55. "Дом над Акой".
13.25. Блакнот.
13.30. Вам гэта трэба?
13.45. Гандлёвы рад.
14.00. Навіны.
14.20. Дыхальная гімнастыка.
14.35. "Чалавек, які смяецца". Мастацкі фільм (Францыя). 1-я серыя.
15.50. Дзіцячы музычны клуб.
16.30. Разам з чэмпіёнамі.
16.45. Да Міжнароднага тэлемарафона "Салдаты XX стагоддзя супраць вайны".
17.00. Навіны.
17.20. Вячэрні альбом.
18.00. Мультфільмы для дарослых.
18.10. Дасье.
18.40. "Час землямераў". 2-я серыя.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. Кінапанарама.
21.50. "Музычнае падвор'е". Забаўляльная праграма Аўстрыйскага тэлебачання.
23.00. Навіны.
23.20. Пяць плюс.
0.20. Тэніс. Кубак Расіі.

Канал "Расія"

7.00. Вестkі.
7.20. Французская мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. "Дамашні клуб".
8.05. Французская мова. 2-гі год навучання.
8.35. Дзіцячая гадзіна (з урокам нямецкай мовы).
9.35. Тэлевізійны фільм.
9.50. "Дар душы". Граф Т.М.Талстой-Міласлаўскі – Расіі.
10.35. Дак.фільмы "Кулунда: трывогі і надзеі", "Забароненыя песенькі".
11.25. Конны тэатр "Нарты".
12.25. "Дзелавое добрасуседства".
12.45. Сялянскае пытанне. Ці будзе сялянская прэса?
13.00. Вестkі.
15.00. Восень жыцця.
15.15. "Адпачыванне". Канцэрт класічнай музыкі.
15.45. Прастора плюс.
16.15. "Мае справы – квітнеючыя паляны". Мастак М.Бялькевіч.
16.45. Т.Ін.Ка.
17.00. Версія.
17.25. Азы кар'еры.
17.40. Вольны час. "Дай лапу, сябра!".
17.55. "Хто ведае – вечнасць ці імгненне".
18.40. Парламенцкі веснік Расіі.
19.00. Вестkі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Расійскае тэлебачанне і РІА ТБ прадстаўляюць...
22.00. Вестkі.
22.25. Расійскае тэлебачанне і РІА ТБ прадстаўляюць...

26, серада

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. "Песня жытнёвага поля". Дак.фільм.
9.00. Гісторыя Беларусі. 9-ы клас.
9.35. Ліра.
11.30. "На ўсё астатняе жыццё". Мастацкі фільм. 2-я серыя.
16.30. Навіны.
16.35. Для дзяцей. "Лянівая прыгажуня". Тэл.спектакль.
17.05. "Раз каўбой, два каўбой". Мультфільм.
17.15. "Вяртанне". Тэленарыс.
18.00. Дзе выйсце з крызісу? Па слядах першай Асамблеі дзелавых кругоў Рэспублікі Беларусь.
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гомель).
19.35. Наш каментарый. "Гонка без фінішу".
19.40. Мы едзем у Рыню... Падрыхтоўка ў Польшчы кадраў па прыватызацыі.
20.25. Калыханка.
20.45. Гандаль-дайджэст.
21.00. Аб партыях без дыпламатыі. "Новая Беларусь": па чутках і з першых вуснаў.
21.20. "Чыста англійскае забойства". Мастацкі фільм. У перапынку (22.40) – НІКа.

I канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.30. Дзіцячы музычны клуб.
8.10. Разам з чэмпіёнамі.
8.25. "Час землямераў". 3-я серыя.
9.45. Кінапанарама.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. "Штрыхі да партрэта". Дак.фільм.
12.05. Новыя імёны.
12.55. Як дабіцца поспеху.
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.20. Сёння і тады.
14.50. "Чалавек, які смяецца". 2-я серыя.
16.00. Да Міжнароднага тэлемарафона "Салдаты XX стагоддзя супраць вайны".
17.00. Навіны.
17.20. Чыя праўда, калі справядлівыя пароўну.
17.50. Я хачу ўбачыць музыку.
18.25. "Час землямераў". 3-я серыя.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. Дак.фільм "Змрок свабоды".
21.30. Тэлевіктарына "Даходнае месца".
22.25. Мастак Таццяна Маўрына.
23.00. Навіны.
23.20. "Што азначаюць вашы імёны?". Забаўляльная праграма.
0.40. Тэніс. Кубак Расіі.

Канал "Расія"

7.00. Вестkі.
7.20. Нямецкая мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. "Пад знакам рыбы".
8.05. Нямецкая мова. 2-гі год навучання.
8.35. Хто косіць ноччу?
9.05. Залатая шпора.
10.05. Дак.фільмы "Алімпійскі прынцэп", "Хлопцы з нашага горада".
10.45. Да 120-годдзя з дня нараджэння А.М.Скрабіна.
11.15. Пятае кола.
13.00. Вестkі.
15.00. Дзіцячая гадзіна (з урокам англійскай мовы).
16.00. Школа менеджэраў.
16.30. "За тых, хто не знайшоў спакою". М.Фейгін.
16.45. Т.Ін.Ка.
17.00. Далёкі Усход.
17.45. Эканом.
18.00. "Расійскі бізнесмен-91". Фінал.
19.00. Вестkі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Прашу слова.
19.45. "Футбол праз гады". Да юбілею М.П.Старасціна.
20.30. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
20.55. "Расійскі бізнесмен-91" (працяг).
22.00. Вестkі.
22.25. Без рэтушы.
23.25. "Экзотыка". Музычная праграма.

27, чацвер

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. "Канец вечнасці". Мастацкі фільм.
10.55. "Снягі". Фільм-канцэрт.
11.15. "На ўсё астатняе жыццё". Мастацкі фільм. 3-я серыя.
16.30. Навіны.
16.35. "Лапік і Воблака". Мультфільм.
17.35. Асаблівы выпадак. Перадача для падлеткаў і бацькоў.
18.00. Фільм "Бярозавыя галасы".
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Гродна).
19.35. Зачытайце маё пісьмо...
19.40. Роднае слова.
20.25. Калыханка.
20.45. Тыдзень беларускага ўрада.
21.00. Справа выпадку. Латарэя ўдачы.
21.05. Крок.
23.10. НІКа.
23.25. Іграе У.Ігалінскі (скрыпка).

I канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.30. Я хачу ўбачыць музыку.
8.00. "Змрок свабоды". Дак.фільм.
9.00. "Даходнае месца". Тэлевіктарына.
9.55. Таленты і паклоннікі.
10.45. "У гасцях у гномаў". Мультфільм.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.20. Пад знакам "пі".
12.10. Чалавек і закон.
12.50. Выступленне ансамбля "Арлоўскі сувенір".
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.20. "Чалавек, які смяецца". 3-я серыя.
15.45. Канцэрт Дзяржаўнага ансамбля танца Калмыкіі "Айраты".
16.15. Конны спорт. Зімнія рысістыя скачкі.
17.00. Навіны.
17.20. Мультфільм.
17.40. ...Да 16 і старэйшым.
18.20. Мастацкі фільм "Канец сезона марожанага" (Польшча).
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. "Чорная скрыня".
21.15. Музыка ў эфіры.
23.00. Навіны.
23.20. Тэніс. Кубак Расіі.

Канал "Расія"

7.00. Вестkі.
7.20. Іспанская мова. 1-ы год навучання.
7.50. Вольны час. "Дамашні клуб".
8.05. Іспанская мова. 2-гі год навучання.
8.35. Дзіцячая гадзіна (з урокам англійскай мовы).
9.35. "Сірын – птушка пеўчая".
10.20. Я і іншыя.
11.30. Дак.фільмы "Крыху лявей Паўночнага полюса", "Хто намалюе каня?".
12.10. "Ноч № 235 на Герцэна, 1".
13.00. Вестkі.
15.00. Узыходжанне да прафесіі – інжынер.
15.30. Паралельныя светы.
16.15. Прыватная школа: за і супраць.
16.45. Т.Ін.Ка.
17.00. Рынак і культура.
17.45. Вольны час. "Увага, здымаю!".
18.00. Парламенцкі веснік Расіі.
18.15. Рыгор Яўлінскі ў студыі "Нотабене".
19.00. Вестkі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Спецыяльны камерцыйны выпуск.
19.40. "Санта-Барбара". 29-я серыя.
20.30. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
20.55. Пятае кола.
22.00. Вестkі.
22.25. Пятае кола. Працяг.
23.10. Фестываль бальных танцаў. конкурс атэстатаў.

28, пятніца

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. "Чыста англійскае забойства". Маст. фільм.
11.25. "Пратакол патаемнай вячэры". Спектакль БТ.
12.40. "На ўсё астатняе жыццё". Маст. фільм. 4-я серыя.
13.40. Дзівосны свет. "Вы – геніяльныя!"
15.30. Меркурый.
16.30. Навіны.
16.35. "Плошча кардонных гадзіннікаў", "Вялікі Ух", "Фімка". Мультфільмы.
17.15. "Еўраспартландыя-92". 1 Міжнародны фестываль для дзяцей.
18.00. "Запаведныя мілі". Дак. фільм.
18.30. Вопыт стварэння маладзёжнай вёскі ў Дортмундзе (Германія).
19.00. Панарама.
19.25. Абласныя навіны (Магілёў).
19.40. Прафсаюзы: праблемы, каментарыі. Прымае ўдзел старшыня ФП Беларусі У.І.Ганчарык.
20.00. "Ане Вескі". Фільм-канцэрт.
20.25. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
21.00. Шанц. Праграма для тых, хто хоча быць багатым і здаровым.
22.05. "Зімовая вішня". Маст. фільм.
23.20. НІКа.

I канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. Мультфільм.
7.50. "Канец сезона марожанага". Маст. фільм.
9.15. Музыка ў эфіры.
11.00. Навіны.
11.20. ...Да 16 і старэйшым.
12.00. Клуб падарожнікаў.
13.00. Іграе Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр.
13.20. Брыдж.
13.45. Бізнес-клас.
14.00. навіны.
14.20. Пераможцы.
15.05. Фільм-дзецям. "Іванка і цар Паганін".
16.25. Мультфільмы.
16.50. Да Міжнароднага тэлемарафона "Салдаты XX стагоддзя супраць вайны".
17.00. Навіны.
17.20. Чао, Буйноў, чао.
17.35. Чалавек і закон.
18.15. "Мая сям'я і іншая жывёла". 8-я серыя.
18.45. "Поле цудаў".
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. "ВІД" прадстаўляе: "Палітбюро", "Музагляд", "Шоу-біржа", "Хіт-канвеер". У перапынку (23.00.) – Навіны.
0.10. "Ружа ў смецці". Маст. фільм.

Канал "Расія"

7.00. Вестkі.
7.20. Час дзелавых людзей.
8.20. Англійская мова. 1-ы год навучання.
8.50. Вольны час.
9.05. Англійская мова. "Сямейны альбом".
9.35. Дак. фільмы "Маці і мачаха", "Маркел-інфарматар", "Чарнобыльская багародзіца".
10.35. "Чуць сябе". Мастак С.Ягораў.
10.55. Пятае кола.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Вестkі.
15.00. Чэмпіянат Еўропы па лёгкай атлетыцы ў закрытых памяшканнях.
16.00. Прастор плюс.
16.30. Т.Ін.Ка.
16.45. Мультфільм.
17.00. ТэлеЭКА.
17.30. "У гонар майстра". Да 80-годдзя Б.А.Пакроўскага.
19.00. Вестkі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. "Санта-Барбара". 30-я серыя.
20.20. На сесіі ВС Расійскай Федэрацыі.
20.50. "К-2" прадстаўляе...
22.00. Вестkі.
22.20. "К-2" прадстаўляе.

29, субота

Беларускае тэлебачанне

8.25. Праграма перадач.
8.30. Раніца рэспублікі.
8.40. Вы прасілі паказаць... "Зімовая вішня". Маст. фільм.
10.05. Меркурый.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Паказвае Віцебск. Мастацка-публіцыстычная праграма.
12.15. Урачыстае адкрыццё Міжнароднага турніру па вольнай барацьбе на прыз А.Мядзведзя.
13.35. Тэлевізійны экалагічны веснік.
14.15. На музычных паралелях. Дж.Расіні. "Стабат матэр".
15.30. Час пісьма.
16.30. У згодзе і спрэчках з Мельпаменай. Народны артыст Беларусі С.Штэйн.
17.15. ПІК.
18.15. Трэці тайм. Футбольны агляд. Прамая лінія.
19.00. Панарама.
19.25. Дыялог. Прымае ўдзел міністр У.Д.Ягораў.
20.25. Калыханка.
20.45. Тэлебіржа.
21.00. Экран беларускага кіно. "Прабач нам, мачаха Расія". Тэл. маст. фільм. 1-я і 2-я серыі.
23.15. НІКа.
23.30. Музыка маёй рэспублікі. С.Картэс. Сюіта з балета "Апошні інка".

I канал. Астанкіна

6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. "Калі медзведзяня прачнецца". Мультфільм.
7.45. Відэаканал "Садружнасць".
9.00. Ранішняя музычная перадача.
9.30. Цэнтр.
10.10. Музычны кіёск.
10.40. Гэта вы можаце.
11.25. Анталогія рускай музыкі. С.Рахманінаў. Рамансы.
11.55. "ЭХ".
12.10. Кніжны двор.
13.00. Тэлегульня "Ключы ад форта Баяр".
14.00. Навіны.
14.20. Кінапраўда? Маст. фільм "Падзенне Берліна". 1-я серыя.
15.40. Прэм'ера шматсерыйнага мультфільма "Пчала Мая".
16.05. "Падзенне Берліна". 2-я серыя. Пасля заканчэння – Адказы на пытанні тэлегледачоў у прамым эфіры.
18.00. У свеце жывёл.
18.45. "Восем дзевак – адзін я". Аўтарская праграма Эльдара Разанава.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.35. Спартыўны вечар. Вынікі Зімняй алімпіяды.
21.40. Заключны канцэрт Міжнароднага фестывалю песні "Сан-Рэма-92". У перапынку (23.00.) – Навіны.
2.00. "Каханне з першага погляду". Дзень 1-ы.

Канал "Расія"

7.00. Вестkі.
7.20. Наш сад.
7.50. Баскетбольны агляд НБА.
8.25. Вольны час.
8.40. Калі вам за...
9.10. Дак. фільм "Канец дваранскага гнязда. Невядомы тэрор".
10.00. Відэаканал "Плюс адзінаццаць".
11.15. Як жыць будзем?
12.00. Рэжысёр эстрады Вадзім Фісон.
12.30. "Бурда модэн" прапануе...
13.00. Вестkі.
13.20. "Саўдзельніца". Маст. фільм.
15.00. Са сваёй званіцы.
15.20. Магі і чарадзеі ў студыі экстра.
17.15. Шматсерыйны мультфільм "Прыгоды Боска".
17.45. Парламенцкі веснік Расіі.
18.00. "Познер і Донах'ю".
18.55. Рэклама.
19.00. Вестkі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Музыка ў стылі пэпсі.
20.30. Маскі-шоу.
21.00. Крымінальны канал "Зусім сакрэтна".
21.55. Рэклама.
22.00. Вестkі.
22.25. "Бізнес МН" прадстаўляе.
22.35. Чэмпіянат Еўропы па лёгкай атлетыцы ў закрытых памяшканнях.

1, нядзеля

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.40. Экран беларускага кіно. "Прабач нам, мачаха Расія". Тэл. маст. фільм. 1-я і 2-я серыі.
10.55. "Амега-спорт" прадстаўляе... "Апараты здароўя".
11.20. Гамбіт. Тэлевізійны шахматны клуб.
11.50. "Еўраспартландыя-92". Фінальныя спаборніцтвы Міжнароднага фестывалю для дзяцей.
13.00. НІКа.
13.45. А.Дудараў. "Вечар". Спектакль.
16.05. Весьціца.
16.20. "Тэлебом". Конкурсная музычная забаўляльная праграма для дзяцей.
17.00. "Ад і да". Тэлетаргі.
17.15. "Адкрый сваё сэрца". Міласэрнасць і грамадства.
17.45. Стракатая музычная скарбонка. Забаўляльная праграма з удзелам дзіцячых мастацкіх калектываў.
18.35. Прэм'ера дак. фільма Беларускага тэлебачання "Да продажу дазволена".
18.55. Рэклама.
19.00. Панарама.
19.20. Сустрэча для вас. Наш госць – начальнік Беларускага ўпраўлення ўнутраных спраў на транспарце генерал-маёр міліцыі, пісьменнік М.І.Чаргінец. Прамая лінія.
20.25. Калыханка.
20.45. Прэм'ера фільма "Поры года". Частка 1-я.
20.55. Рэклама.
21.00. "Жаніцьба Бальзамінава". Маст. фільм.
22.25. Міжнародны турнір па вольнай барацьбе на прыз А.Мядзведзя. Фіналы.

I канал. Астанкіна

7.00. Рытмічная гімнастыка.
7.30. Тыраж "Спортлато".
7.45. Дапамажы сабе сам.
8.15. Раным-рана.
9.00. Магчыма ўсё.
9.30. "Служэнне муз не церпіць мітусні..."
10.15. Ранішняя зорка.
11.05. Мультфільм.
11.20. IX Міжнародны фестываль тэлепраграм народнай творчасці "Вясёлка".
11.55. Відавочнае-неверагоднае.
12.35. Па той бок рампы з усмешкай.
12.55. Прэм'ера маст. фільма "Багатыя таксама плачуць".
14.00. Навіны.
14.20. Дыялог у прамым эфіры.
15.00. "Шмат музыкі". Дадатак да перадачы "Рок-урок".
15.50. Тэлелоцыя.
16.00. Пані ўдача.
16.55. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45. Навіны.
18.00. Сатырычны прагноз.
18.10. Клуб падарожнікаў.
19.05. "Хто з намі?" У падтрымку фермерскага руху.
19.25. Фільмы рэжысёра Г.Даніеля. "Асенні марафон".
21.00. Вынікі.
21.45. Дабрачынны канцэрт, падрыхтаваны для міжнароднай акцыі "Жанчыны свету – супраць наркотыкаў".
1.05. "Каханне з першага погляду". Дзень 2-гі.

Канал "Расія"

7.00. Вестkі.
7.20. Конкурс юных музыкантаў.
7.50. Хочаце, верце.
8.20. "За тых, хто не знайшоў спакою". М.Фейгін.
8.35. Хто заказвае музыку.
9.05. Рускі век.
10.00. "Суперкніга". Мультфільм. 2-я серыя.
10.30. Аты-баты...
11.00. Тэлевізійная служба "Здароўе".
11.30. Існа – лепшы сябар. Конкурсная праграма.
12.30. "Мой ласкавы і пяшчотны звер". Пра 120-ы міжнародны пушны аўкцыён.
13.00. Вестkі.
13.20. Паралелі.
13.50. Лясы.
14.30. К.Мажэйка. "Рэпартажы з ПАР".
15.00. Пецярбургскі міф. "Фантанны дом". Жанчыны з сямейства Шарамецевых.
15.35. "Манера". Азбука зносін.
16.20. "Там быць тут". Прэзентацыя абэрыуцкага нумара часопіса "Тэатр".
17.00. Чэмпіянат свету па баскетболу сярод прафесіяналаў НБА.
18.00. Чэмпіянат Еўропы па лёгкай атлетыцы ў закрытых памяшканнях.
18.55. Рэклама.
19.00. Вестkі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. XX стагоддзе: у кадры і за кадрам.
20.35. Тварам да Расіі.
20.55. Кабарэ "Бязглуздзіца".
21.55. Рэклама.
22.00. Вестkі.
22.20. "Бізнес МН" прадстаўляе.

Сцэнкі абсурду

ГІСТОРЫЯ ТАНКЕТКІ

Аднойчы танкетцы стала сумна і яна вырашыла пайсці ў манастыр. У манастыры ёй стала сумна ўтрая, бо тут прыйшлося пасціць. Тады танкетка ўспомніла сваё басотнае дзяцінства і спляжыла манастыр на горкі яблык. Пазбаўленая апошняга сродку існавання танкетка апынулася на панелі. Тут яе падабраў камерсант, які гандляваў цукерачнымі абгорткамі. Удала падабраная абгортка зрабіла танкетку ўраз сусветна вядомай і канкурэнтназдольнай. Больш яна не сумавала, а зруйнаваны манастыр стаў знакаміты тым, што калісьці яго спляжыла сусветна вядомая танкетка.

мал. В.Саковіча

Ігар Сідарук.

Вайсковы фальклор

- Гэй вы, утрох. Хадзіце абодва да мяне. Чаго глядзіш, я табе кажу.
- Усіх адсутных паставіць у адзін шыхт.
- Што за свіння тут натаптала? Карова, ці хто?
- Калі згубіце напрамак — шукайце ракету.
- Ангіна, кажаш? Статуты трэба вывучаць — горла хварэць не будзе.

- Наступленне пачынаем увечары, на світанку.
- Спачатку пойдуць людзі, а потым паедзем мы.
- Ядзерная бомба заўсёды трапляе ў эпіцэнтр.
- Павывесці б вас у поле... паставіць тварам да сцяны... ды і пусціць кулю ў лоб!!!
- Танкі наступаюць невялікімі групкамі, па дватры чалавекі.
- Боты трэба чысціць увечары. Каб з раніцы апранаць іх на свежую галаву.
- Дакладайце пра наяўнасць байцоў. Хто не ўсе, таго пакараем.

* * *

Лейтэнант Сміт правёў ноч з прастытуткай. Раніцай апрануўся і накіраваўся да дзвярэй.
— А грошы?— спытала дзяўчына.
— Міс, афіцэры грошы не бяруць.

* * *

У цягніку едзе вайсковец. Ён здымае боты, затым шкарпэткі і рыхтуецца да сну. У купэ ўсе заціскаюць насы і адзін з пасажыраў пытаецца ў вайскоўца:
— Шаноўны, вы шкарпэткі мяняеце?
— Толькі на гарэлку!

Забытая «слава»

МЕХ БУЛЬБЫ

Мо каму і дзіва дзіўнае, а я асабіста ўжо прызвычаіўся, што ва ўсіх куточках краіны бульба — самы што ні ёсць дэфіцыт. Не здолееш усю зіму яе захоўваць як след, то ідзі на базар, па кіло ці па два нясі дахаты ў кожную нядзелю. Калі, зразумела, грошай шмат маеш.

Той жа клопат меўся і ў афіцэраў нашага гарадка. А як найболей — то ў жонак. Хаця мо нават і вастрэй усе праблемы адчуваліся, чым мясцовым жыхаром. Хто з Беларусі, той кілаграм і за "чырвонец" пойдзе купляць. Што ні кажы, сапраўды бульба — другі хлеб.

Разумеюць гэта і прапаршчыкі, і лейтэнанты, і палкоўнікі... Не ведаю, ці турбуюць зямныя клопаты генералаў, а вось (найбольш патрабавальную) палову іх шчаслівых сем'яў... Ізноў зразумелая справа — хто на кухні гаспадарыць, хто стравы там загадвае?..

Наш начальнік палітаддзела, відаць, думкі генеральскіх жонак на адлегласці чытае. Бо як толькі хто ў цэнтр збіраецца, то адразу даручэнне дае:

— Заедзь, хлопец, на склад, прыхапі мяшочак бульбачкі. А ў штабе корпуса зазірні да генерала Паўленкі ды скажы, што, маўляў, Іван Мікалаевіч перадаў... А сам мех на кватэру яму завязеш.

Ні кожнаму, зразумела, справу такую даручаў наш галоўны дывізійны нампаліт. Часцей — старшаму лейтэнанту Васілю Рыхнусаву. Пасаду той займаў ва́жкую — старшы інструктар палітаддзела па культурна-асветнай рабоце. Адукацыю таксама меў адпаведную. Ведае, як падысці. Перад кім і як дзверы адчыніць. Раней гонар выконваць "бульбяныя" даручэнні меў і камсамольскі работнік Павел Піліпавіч Гарбузоўскі. Улетку ж яшчэ і памідорчыкі вазіў, тады-сяды вінаград....

Васіль — у гэтай справе навічок. Вось і даводзіцца Івану Мікалаевічу перад кожнай паездкай даваць падначаленаму падрабязны інструктаж: як ступіць, як у кватэру ці ў гараж мех унесці. І як тактоўна, неўпрыкмет (але ж, каб пачулі!) падкрэсліць, што гэта, маўляў, Іван Мікалаевіч перадаў. Васіль — чалавек творчы. Ён і пры чужых мірганнямі ды эзэпавай мовай усё можа перадаць, сказаць, даць зразумець.

Апошнім разам начальнік палітаддзела інструктаж наладзіў асабліва доўгі. Прычынай — новы камандзір корпуса генерал Каленкаў. Чалавек відны. Жывата вялікага, як у астатніх генералаў, няма. І ростам выйшаў. Сапраўдны генерал.

...З камкорам Васіль сутыкнуўся на лесвіцы. Васіль праявіў знаходлівасць...

— Таварыш генерал-лейтэнант, я вам фотаздымкі прывёз з дывізіі...

— Ну, дык давайце ж, — памякчэў позіркам генерал.

— А яны — у машыне, — шукаў далейшага ратунку афіцэр.

Васіль хацеў было нешта яшчэ дадаць, але ўніз па прыступках спускаўся другі генерал.

— Таварыш старшы лейтэнант, я вас чакаю... Дзе фотаздымкі?

— Таварыш генерал-лейтэнант, я пераблытаў... Я толькі мех бульбы прывёз...

— Ад каго?

— Іван Мікалаевіч перадаў...

Генерал не спахмурнеў, не памякчэў, застаўся ранейшым — незразумелага настрою.

Трэніроўка! Падначаленыя нічога не павінны не заўважаць, не разумець.

— Скажыце вашаму Івану Мікалаевічу, што мне нічога не трэба, у мяне ўсё ёсць... Адвязіце мех бульбы назад.

Павярнуўся. І пайшоў назад... Але ж, відаць, таму назад, што пагубіўся — і да "Волгі" сваёй службовай.

Стомлена паплёўся і Васіль да сваёй машыны. Плюхнуўся на сядзенне.

— Паехалі...

Машына тарганулася, праз якую сотню метраў застыла на перакрыжаванні дарог.

— Куды?.. На кватэру да камкора, таварыш старшы лейтэнант?.. — завучана пацікавіўся вадзіцель.

— Ды ідзі ты... — Рыхнусаў хацеў было вылаяцца, але ваенная культурна-асветніцкая адукацыя стрымала. — У дывізію...

А ехаць жа ўсяго хвілін пятнаццаць. Васілю хацелася расцягнуць іх на ўсю будучую службу... "Нічога ж і не было, здаецца... Ну і генерал... Яму ж не хабар, а мех бульбы... Дзівак-чалавек... А мо яму з іншай часці возяць?".

Алесь Карлюкевіч.

Дзяжурны рэдактар А. КАМІНСКІ.

Мастацкае афармленне нумара В. ДУБОВІКА.

ЧЫРВОНАЯ Змена

Заснавальнік: ЦК ЛКСМБ
Выдавец: газетна-выдавецкая фірма "Белая Русь"
Газета ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.
АДРАС рэдакцыі: 220041, г.Мінск, праспект Скарыны, 77.
ТЭЛЕФОНЫ: 32-13-54, 32-50-01.
Газета набрана і звярстана ў наборна-выдавецкім бюро газетна-выдавецкай фірмы "Белая Русь".
Друкарня выдавецтва "Беларускі Дом друку", г. Мінск.
Індэкс 63906. Тыраж 19050.

Галоўны рэдактар Уладзімір БЕЛЬСКІ.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Алена АГІБАЛАВА, Валерый ВАРАНЕЦКІ, Валерый ІВАНОЎ, Алег КАМІНСКІ (першы нам. гал. рэдактара), Віктар ЛЮКОВІЧ, Мікалай ЛАРКОВІЧ, Алесь МАСАРЭНКА, Станіслаў НІЧЫПАРОВІЧ, Алесь ПАЛЫНСКІ, Наталля ПЛЫТКЕВІЧ, Павел СІМАНАЎ (нам. гал. рэдактара), Алег СЛУКА, Кузьма ШАПЛЫКА.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных звестак, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымліваліся звесткі, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

Рэдакцыя рукапісы не рэцэнзуе і не вяртае.

Рэдакцыя газеты "Чырвоная змена" прымае заказы на змяшчэнне аб'яў, рэкламы. Даведкі па тэлефонах 32-12-82, 32-50-01.

Зак. № 8.

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12